ПАСЯБРАВАЛІ ☞ 10

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 20 (2505) Год XLIX | Беласток, 16 мая 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Віленскія беларусы прыступілі ў Еўрасаюз з канкрэтнай культурнай прапановай. У апошні дзень красавіка адбылася тут канферэнцыя прысвечаная Францішку Аляхновічу...

Вільня ў Еўрасаюзе

Апоўначы ў цэнтры Вільні пачуліся стрэлы і феерверачны грукат. Еўрасаюз завітаў сюды паводле літоўскага часу, гадзіну раней чым у Польшчу. На вуліцы Жалезнага ваўка (міфічнага заснавальніка Вільні), што на перыферыі горада, панавала будзённая цішыня. Ніхто не спяваў гімна ЕС „Да радасці", не страляў коркамі ад шампанскага, не гуляў па вуліцы. Не пашанцавала нават прыкмеціць еўрасцягаў. Калі гістарычны момант абвясцілі ў тэлебачанні, нямногія, як мы, кінуліся на балкон паглядзець каляровыя феерверкі, якія на момант рассвятлілі неба над гістарычнай сталіцай Вялікага княства Літоўскага. Пасля дзесяці хвілін у квартале ўжо спалі.

— Людзі баяцца, што ўсё падаражэ, — чуем апраўданне адсутнасці еўраэнтузіязму.

Як і ў нас, першае месца сярод калькуляцыі занялі гутаркі пра цану цукру.

У Літве жыццёвы стандарт ніжэйшы чым у Польшчы. Асабліва занядбаная сельская гаспадарка на захадзе краіны, дзе большасць аблогаў і лясоў, ды выміраючыя вёскі. Таксама ў квартале „Красняк", дзе спыніліся мы на начлег, панаваў постсавецкі маразм, а ў трамваі, на якім дабіраліся мы ў цэнтр, размаўлялі на расійскай мове, якой прынцыпова не „разумеюць" у дзяржаўных установах.

* * *

Віленскія беларусы прыступілі ў Еўрасаюз з канкрэтнай культурнай прапановай. У апошні дзень красавіка адбылася тут канферэнцыя прысвечаная Францішку Аляхновічу. Яшчэ да вайны яго антысталінскі твор „У кіпцюрах ГПУ" быў перакладзены на партугальскую, італьянскую, украінскую і рускую мовы. Францішак Аляхновіч — аўтар дваццаці драматычных твораў, акцёр, публіцыст і палітычны незалежніцкі дзеяч, як першы паказаў пекла сталінскіх лагераў і нечалавечы воблік бальшавіцкай ідэі.

— У гэты цудоўны, святочны дзень, — сказаў Сяргей Вітушка, які разам з жонкай Людвікай узяў на плечы арганізацыю мерапрыемства, — Ф. Аляхновіч прысутны з намі духам. Вось, пасля шасцідзесяці гадоў, магілу бацькі наведалі сыны літаратара пражываючыя ў Польшчы: Юрый і Казімір Аляхновічы. Іх успаміны ўваскрашалі даваенны шматкультурны воблік Віленшчыны і прыродную талерантнасць мясцовых жыхароў. Іх бацька — як сцвердзілі — выхаваны ў польскай культуры, астаўся беларусам з выбару.

Магілу на віленскіх Росах наведалі сыны літаратара пражываючыя ў Польшчы: Юрый (пяты злева) і Казімір Аляхновічы (трэці злева) з праўнучкамі Францішка

— А ці вядомае ў Беларусі імя Аляхновіча выпускніку сярэдняй школы, — пытаю прафесара Анатоля Сабалеўскага.

> *Літоўцы таксама ўжо „палюбілі" польскіх турыстаў, і нават на прэтэнцыёзныя ўвагі że Wilno to przecież polskie miasto! адказваюць з ветлівай усмешкай...*

— Я не ўпэўнены, што ведаюць яго ўсе студэнты тэатральных аддзяленняў, — пачуўся сумнавядомы адказ.

Менавіта, навуковыя чытанні пра жыццё і творчасць Францішка Аляхновіча, прадставілі мінскія вучоныя Анатоль Сабалеўскі і Уладзімір Ляхоўскі. А мастацкі бок імпрэзы папоўнілі віленскія акцёры, якія чыталі фрагменты п'есаў, ды канцэрт Віктара Шалкевіча, які, як выявілася, з'яўляецца вялікім фанатам Францішка Аляхновіча.

Пры нагодзе ўзнікла телеперадача для беларусаў Літвы.

* * *

Першы дзень у Еўрасаюзе пачаўся надзвычай весела. З самага ранняя нашым гаспадарам пазваніў еўраэнтузіяст мастак.

— Ведаеце, брэндзі патаннела! — заявіў адразу пасля віншаванняў. Сапраўды, гэтая навіна дала нам натхненне на ўвесь дзень. Пасля, калі мы хадзілі па вуліцах сталіцы, чамусьці ў сметніках валяліся выключна бутэлькі з-пад брэндзі.

Найбольш еўраэнтузіястаў мы сустрэлі ў цэнтры Вільні, асабліва на Антокалі, дзе царылі апранутыя ад пят па бараду ў чорныя скураныя формы матацыклісты-байкеры. Увесь дзень праследаваў нас адкрыты, на манер кабрыялета, жоўта-сіні аўтобус, на якім гуляла моладзь. Вечарам усе шляхі вялі на Белы масток, дзе выступалі зоркі айчыннай эстрады.

Побач Вострай брамы, ад ранку да вечара, выстойвалі бясконцыя калоны аўтобусаў з усёй Польшчы. Ад двух-трох гадоў на майскі доўгі уікэнд у Вільню паломнічае асабліва многа жыхароў Варшавы. Цягне іх сюды сантымент і прагматызм. Бо тут, за меншыя грошы можна пасмакаваць Еўропу. Літоўцы таксама ўжо „палюбілі" польскіх турыстаў, і нават на прэтэнцыёзныя ўвагі *że Wilno to przecież polskie miasto!* адказваюць з ветлівай усмешкай.

Ганна Кандрацюк

Рускае моўнае лобі ☞ 2

Віталь Луба

„Гэта ж зусім ненармальнае, што ў сталіцы краіны з ліку 240 школ, толькі ў дзесяці заняткі вядуцца на беларускай мове, — піша публіцыст. — Гэта менавіта спадчына ад СССР, але хіба ўжо даспеў час, каб гэтую паранойную сітуацыю змяніць — нават насуперак процістаянню рускаму лобі ў гэтай краіне. Беларусь — айчына беларусаў, а не рэштак, прашу прабачэння, «савецкага народа»"...

Пасланні з Цэнтра ☞ 2

Віктар Сазонаў

Праўда, ніхто з дакладнасцю не можа сказаць, дзе цяпер Усход, а дзе Захад, і што канкрэтна перашкаджае ім зысціся. Толькі жыхары краіны, якія гатовыя, як сказаў яе кіраўнік, аддаць усё, акрамя сваёй незалежнасці, добра ведаюць адказы. Захад — на захадзе ад Беларусі, а Усход — гэта Расія. Мы яшчэ дакладна ведаем дзе Цэнтр Еўропы, і хто пуп планеты...

Арлянскія клопаты ☞ 4

Міхал Мінцэвіч

У Арлянскай гміне няма каналізацыйнай сеткі. Ачышчальні ёсць толькі ў пасляпэгэраўскім пасёлку ў Дыдулях і ў Орлі, у якой сцёкі паступаюць толькі са школы; абедзве ачышчальні змагаюцца з клопатамі...

Дыпламаты дзецям ☞ 5

Мікола Ваўранюк

Дзеці спаткаліся з беларускімі дыпламатамі ў Генеральным консульстве 5 мая. Разам з вучнямі ПШ н-р 4 былі там таксама дашкольнікі з Дзіцячага садка н-р 14. Настаўніцам садка Пасольства Рэспублікі Беларусь у Варшаве падаравала вышываныя кашулі...

Беларусы Манрэалю ☞ 8

Ася Кандрацюк

За чаркай віна адзін пажылы мужчына расказаў мне: „Ані мае дзеці, ні ўнукі не гавораць па-беларуску. Дзеці гаварылі да пяці гадоў, пакуль не пайшлі ў школу. Потым пачалі рабіць смешныя памылкі: замест «яна» скажуць «ён пайшоў у парк». Мы з жонкай вельмі з іх смяяліся і ўвесь час папраўлялі. Калі яны падраслі, заявілі, што будуць да нас звяртацца выключна па-англійску"...

Беларускія спартсмены ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

Першай асобай з Беларусі, якая мела дачыненне да алімпіядаў быў Зыгмунт Мінейка, удзельнік паўстання 1863 года. Лёс гэтага чалавека незвычайны. Нарадзіўся Мінейка ў 1840 годзе ў вёсцы Балванішкі на Ашмяншчыне (у 1969 годзе саветы змянілі назву мясціны на Зялёны Бор)...

9 770546 196000

Рускае моўнае лобі

Нядаўна трапіў мне ў рукі артыкул „Беларусь паміж молатам і накавальняй" Яна Цехановіча апублікаваны на старонках штотыднёвіка „Tylko Polska". Аўтар выказаў у ім спадзяванне, што неўзабаве Аляксандр Лукашэнка памяняе сваю тактыку ў адносінах да беларускай мовы. „Гэта ж зусім ненармальнае, што ў сталіцы краіны з ліку 240 школ, толькі ў дзесяці заняткі вядуцца на беларускай мове, — піша ён. — Гэта менавіта спадчына ад СССР, але хіба ўжо даспеў час, каб гэтую паранойную сітуацыю змяніць — нават насуперак процістаянню рускаму лобі ў гэтай краіне. Беларусь — айчына беларусаў, а не рэштак, прашу прабачэння, «савецкага народа»".

А мне здаецца, што менавіта пры цяперашнім прэзідэнце беларусізацыя немагчымая, поколькі гэта ў пачатку ягонага прэзідэнцтва рускай мове быў нададзены статус дзяржаўнай, што ўмацавала яе дамінуючую пазіцыю і прывяло да спынення выканання пастановы Вярхоўнага Савета аб паступовым пераходзе адміністрацыі і справаводства на мову тытульнай нацыі. Для гэтага павінна быць палітычная воля кіруючай эліты, а яна ў Беларусі поўнасцю русіфікаваная. А калі ўлічыць сілу рускага моўнага лобі, беларусізацыя адыходзіць на бліжэй неакрэсленую перспектыву.

Прыкладам гэтаму можа быць Украіна. Хаця там гадамі вядзецца ўкраінізацыя, а прэзідэнт Леанід Кучма прамаўляе на ўкраінскай мове, да паўсюднай прысутнасці яе ў жыцці грамадства яшчэ далёка. А моцнае рускае лобі ў сваю чаргу што і раз выказвае сваё незадавальненне паступовым выцясненнем рускай мовы з публічнага ўжытку. Калі ў палове красавіка Нацыянальная рада па пытаннях тэлебачання і радыёвяшчання забавязала ўсе агульнанацыянальныя тэле- і радыёкампаніі перавесці вяшчанне выключна на ўкраінскую мову, у расійскіх і рускамоўных СМІ прагучалі словы абурэння, а само рашэнне ўспрымалася як атака на рускую мову. Пасол Расіі Віктар Чарнамырдзін прыгадаў, што на Украіне жыве 15 млн. рускіх і апрача таго шмат украінцаў прывыкла размаўляць на рускай мове і менавіта таму „ад рускага нельга адмахвацца". Палітолаг Уладзімір Малінковіч палічыў, што „рашэнне Нацыянальнай рады парушыла Канстытуцыю Украіны, гарантуючую моўнае раўнапраўе, і еўрапейскую Хартыю аб мовах". Старшыня парламенцкага камітэта па пытаннях свабоды слова Мікалай Томенка прыгразіў, што ў Вярхоўнай Радзе дастаткова галасоў, каб цяперашні састаў Нацыянальнай рады адправіць у адстаўку, паколькі не адлюстроўвае ён суадносін сіл у парламенце. Галоўны рэдактар кіеўскай радыёстанцыі „Континент" Сяргей Шолах вырашыў падаць іск у Еўрапейскі суд па правах чалавека супраць дзяржавы Украіна, паколькі ў выніку згаданага рашэння пагражае яму страта ліцэнзіі.

Старшыня Нацыянальнай рады Украіны Барыс Холад прынятае рашэнне назваў „гістарычным" і патлумачыў, што „калі мы хочам захаваць украінскую нацыю і папаўняць яе культуру, мы павінны выразна і ясна сказаць, што мовай тэле- і радыёэфіру павінна быць украінская". Каментатар рускага тэлеканала ОРТ у сваю чаргу рашэнне Нацыянальнай рады назваў „гістарычнай памылкай".

Паводле даных перапісу насельніцтва ад 1989 г. на Украіне 54% насельніцтва лічыць рускую мову сваёй роднай, а да 80% — карыстаецца ёю як дапаможнай у бытавой і вытворчай сферах. За апошнія 10 гадоў колькасць школ з рускай мовай навучання скарацілася ўдвая.

У Беларусі 80% насельніцтва карыстаецца рускай мовай, г.зн. практычна ўсе гарадскія жыхары. У Рэспубліцы Беларусь руская мова вывучаецца ва ўсіх школах у абавязковым парадку. З'яўляецца яна мовай большай часткі сродкаў масавай інфармацыі Беларусі — рускай карыстаецца пераважная большасць перыядычных выданняў, тэле- і радыёстанцый.

І на Украіне, і ў Беларусі праціўнікі выцясняння рускай мовы з афіцыйнага, публічнага ўжытку ў якасці контраргумента прыводзяць факт, што амаль усё насельніцтва як адной, так і другой дзяржавы разумее рускую мову і вельмі многія грамадзяне размаўляюць на ёй. Аднак яны нават не дапускаюць да сябе думкі, што і рускім не цяжка зразумець мову заходніх пабрацімаў. Усе ж яны — усходнеславянскія. Рускае моўнае лобі трымаецца моцна.

Віталь Луба

Пасланні з Цэнтра Еўропы

Сцвярджэнне, што ўсход ёсць усход, а захад ёсць захад, і ніколі ім не зысціся ведае кожны. Праўда, ніхто з дакладнасцю не можа сказаць, дзе цяпер Усход, а дзе Захад, і што канкрэтна перашкаджае ім зысціся. Толькі жыхары краіны, якія гатовыя, як сказаў яе кіраўнік, аддаць усё, акрамя сваёй незалежнасці, добра ведаюць адказы. Захад — на захадзе ад Беларусі, а Усход — гэта Расія. Мы яшчэ дакладна ведаем дзе Цэнтр Еўропы, і хто пуп планеты. Для нас у геаграфіі незразумелае толькі адно пытанне — дзе Украіна? На захадзе, на усходзе ці на поўдні ад нас. Галоўнае, каб украінцы не прэтэндавалі на Цэнтр, а мы дазволім ім самім вызначаць сваё геаграфічнае месцазнаходжанне, як гэта зрабілі паўночныя ад нас балты і сталі Захадам.

У штогадовым пасланні прэзідэнта Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь і беларускаму народу, кіраўнік дзяржавы так і заявіў, што „сёння Беларусь — гэта фактар міжнароднай бяспекі. Стварацъ у цэнтры Еўропы зону нестабільнасці абыдзецца сабе даражэй". Хто канкрэтна стварае гэтую жахлівую зону сказана не было. Затое было выказанае жаданне жыць з суседнім Еўрапейскім Саюзам як з раднёй — у міры і згодзе. З Расіяй таксама, хоць да яе і ўзнікла безліч прэтэнзій. Але мы не злапамятныя. Пра іншых мы заўсёды дбаем больш чым пра сябе. Мяркуйце самі. Хто так турбаваўся пра эканамічныя страты Захаду, калі Расія перакрыла нам газ? А хто непакоіцца, што НАТАўскія самалёты лётаюць над Літвой і бачаць стратэгічныя аб'екты Усходу аж да Крамля?

Нафталінавай настальгіі па Савецкім Саюзе ў пасланні не прагучала. Затое, нарэшце, мы зразумелі, што кардынальна рознімся ад расіян. Гэта выцякае з пастаўленых задачаў: не піць на працы, быць дысцыплінаванымі, працавітымі, арганізаванымі. Галоўнае, як сказаў сам прэзідэнт, не даводзіць яго дырэктывы да абсурду, ісці ад жыцця.

А жыццё не перастае здзіўляць унікальнасцю і непаўторнасцю нашага ж выбару. У нас, у Цэнтры, усё не так як па краях. У нас не такія як у іншых і дэмакратыя, і цэнтралізаваная ўлада. А самае парадаксальнае — наша цэнтралізаваная ўлада абвясціла сябе гарантам нашай дэмакратыі.

Ды што там пра ўладу. У нас і апазіцыя такая, якой у свеце не знойдзеш. Адзін прадстаўнік парламенцкай апазіцыі падчас абмеркавання ўсё таго ж паслання, хоць і не хавае свайго захаплення заходнім ладам жыцця, спытаў, ці не збіраецца прэзідэнт прасіць прабачэння ў свайго ўсходняга калегі. А ведаеце за што? За тое, што той некарэктна лаяўся наконт перакрыцця нам газу. Для Палаты прадстаўнікоў РБ гэта быў сапраўды нечаканы ход апанентаў. Хіба ні адзін з яго дарадцаў не змог дадумацца і папярэдзіць, што такое можа стацца. І цяпер ужо сцвярджэнні прэзідэнта, што ў нас самая прарасійская палітыка, і, разам з тым суверэнітэт і незалежнасць самыя вялікія каштоўнасці, могуць заняць толькі другое месца ў спісе парадоксаў палітычнай рыторыкі.

Не было ў пасланні сказана толькі пра нашу палітычную сістэму. А яна ў Цэнтры таксама розніцца ад усіх вядомых чалавецтву варыянтаў. Ёсць у свеце аднапартыйныя сістэмы, як некалі ў СССР, шматпартыйныя, як у Еўропе, і двухпартыйная, як у ЗША. Мы, цяпер, стварылі трохпартыйную, толькі не паспелі зацвердзіць яе заканадаўча, бо сябры партый яшчэ не вызначыліся, хто да якой належыць. Першая партыя — партыя ўлады. У яе патрапіць найцяжэй. Затое там найлепей жыць. Яна мае сімволіку і грошы, але ўвесь час шукае сваю ідэалогію. Другая партыя апазіцыйная. Складаецца з некалі рамантычных, а зараз ужо і дастаткова вопытных змагароў за беларускасць. Яна мае ідэалогію і сімволіку, за што яе і дубасяць, але не мае грошай. Трэцяя партыя таксама апазіцыйная. Яна ўсмактала людзей, якія былі так ці інакш звязаныя з першай або другой. Мае грошы, але не мае сімволікі, і гатовая стаць пад любую, якая вышэй залунае. Такая ў яе ідэалогія. На сёння сябры дзвюх апошніх партый не ведаюць яшчэ пра існаванне трохпартыйнай сістэмы, і памылкова ўваходзяць у розныя шматлікія арганізацыі і палітычныя партыі. Ім вызначыцца дапамагае партыя ўлады, зачыняючы арганізацыі дзе ўсё так наблытана, і даючы магчымасць іх сябрам вырашыць, да якой з дзвюх апазіцыйных партый яны належаць.

Ёсць у нас і беспартыйныя. У адрозненне ад партыйных, яны добра ведаюць пра існаванне трохпартыйнай сістэмы. У іх толькі чатыры пытанні. Да трэцяй партыі — „А ці трэба нам мяняць кіраўніка дзяржавы?" Да другой — „Калі трэба мяняць, то як?" І да першай — „Як вырашыце ўсё ж памяняць, то калі?" А чацвёртае пытанне да ўсіх разам — „Калі мяняць, то на каго?" А пакуль ад нікога няма адказу, яны проста радуюцца, што жывуць у Цэнтры. Маўляў, якога яшчэ падарунку можна прасіць у лёсу? Яны маюць і сваё асабістае пасланне. Пасылаюць усіх.

Віктар Сазонаў (Гродна)

Вачыма еўрапейца

Выпадак, ці тэст?

— Не можа быць ніякай жалезнай заслоны, — сказаў аб стасунках з усходнімі суседзямі Польшчы яшчэ да пашырэння Еўрасаюза Лешак Мілер. Пазней Марэк Бэлька, яшчэ да назначэння на прэм'ера таксама асцерагаў: — Не можа быць нават блакітнага муру. Як, аднак, канкрэтна маюць выглядаць адносіны еўрасаюзнай Польшчы з Беларуссю, ні адзін палітык не адважыўся сказаць, прынамсі да часу ўзнясення польскіх сцягоў на мачты ў Дубліне і Бруселі. Мабыць, штосьці вынікне з найбліжэйшай дэбаты некалькіх соцень дэпутаваных у час апошняга ў гэтай кадэнцыі пасяджэння Еўрапарламента. Ягоны старшыня Пат Кокс заявіў аб дыскусіі на тэму ўсходняй палітыкі ЕС. Нашы палітыкі хацелі б у ёй — як заяўляюць — мець вядучую ролю.

Не найлепш прадказвае той усходняй палітыцы інцыдэнт, да якога дайшло ў Мінску некалькі дзён да ўваходу новай дзесяткі ў ЕС, які нагадвае часы „жалезнай заслоны". Палкоўніка Казімежа Віташчыка, вайсковага аташэ Польскага пасольства, злавілі на разведачнай дзейнасці. У афіцыйным камюніке беларускага МЗС ягоную дзейнасць назвалі: „... неадпавядаючай духу ў апошні час наладжанага канструктыўнага польска-беларускага дыялога. Выклікае гэта тым больш шае здзіўленне дзень да пашырэння ЕС і ў сувязі з актыўнай роляй Польшчы ў фармаванні суседскай палітыкі ЕС".

Калі ўспыхнула справа аташэ Віташчыка, польскія СМІ ў першую чаргу паведамлялі аб затрыманні ды нічога не казалі аб прычынах. Ані з боку КДБ, ані польскага пасольства ў Мінску журналісты не атрымалі тлумачэнняў. Аднак польскія тэлестанцыі інфармавалі, што палк. Віташчык быў патрактаваны як непажаданая персона і выдвараны з Беларусі. Аднак зараз жа МЗС у Мінску, а за ім пасольства ў Варшаве адзначылі: „Дзеля захавання канструктыўнага дыялогу паміж абедзвюма дзяржавамі, беларускі бок дазволіў польскаму дыпламату без перашкожд пакінуць тэрыторыю РБ, не трактуючы яго як непажаданую персону". І на канец: „Беларускі бок успомненае здарэнне лічыць палагоджаным і выступае за далейшы развой беларуска-польскага супрацоўніцтва ва ўсіх сферах". Нідзе ў агульнапольскіх СМІ не пачуў я гэтых тлумачэнняў. „Выбарчая газета" спрабавала рассакрэціць, як быў злоўлены Віташчык: „У час перашуквання ў ягонай кішэні быццам былі знойдзены планы дыслакацыі і ўзбраення 302 Беларускай супрацьтанкавай брыгады".

„Выбарчая" і іншыя СМІ ў Варшаве інфармавалі таксама, што ў сувязі з інцыдэнтам меў адмяніць свой візіт на Эканамічным саміце ў сталіцы Польшчы прэм'ер Сяргей Сідорскі (планавалася таксама наведанне ім Беларускага музея ў Гайнаўцы і фірмы „Пронар" у Нарве). Рыдыё Беласток, аднак, выказала ўласны тэзіс, быццам адмена візіту беларускага прэм'ера была звязана з асуджэннем Парламенцкай Асамблеяй Савета Еўропы Беларусі як недэмакратычнай краіны. „Для раўнавагі" спыталіся аб гэтым у пасла Паўла Латушкі, які запярэчыў. У сваю чаргу польскае МЗС запратэставала: „Затрыманне дыпламата адбылося пры парушэнні нормаў вынікаючых з міжнародных трактатаў, бокам якіх з'яўляецца Беларусь". І больш-менш — гэта ўсё. Разведваў, ці не, палкоўнік Віташчык?..

Як сапраўды было, не ведаю, але ў мяне ўражанне, што ў здарэння з палк. Віташчыкам „адзін : нуль" для беларускага боку. Варшава, здаецца, не мела часу адразу, дзень да ўваходу ў ЕС, займацца тлумачэннем такіх усходнееўрапейскіх матываў. Ці зможа ў такім разе займацца іншымі матывамі тае палітыкі ў яе беларускай частцы?

Мацей Халадоўскі

Жыццё з музыкай

Летам гэтага года дырэктар Бельскага дома культуры Сяргей ЛУКАШУК будзе святкаваць шасцідзесяцігоддзе з дня нараджэння і сарокагоддзе прафесійнай і мастацкай працы. З дзяцінства любіў ён музыку і таму выбраў адукацыю, прафесійную і грамадскую працу, шчыльна звязаныя з музыкай.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Сяргей Лукашук нарадзіўся 22 ліпеня 1944 года ў хатцы каля станцыі Рыгароўцы. Тады савецкія войскі атакавалі ад Кляшчэляў, а немцы знаходзіліся ў Дубяжыне і Градалях. Калі Сяргею было некалькі гадзін, немцы выгналі з хаты маці з нованароджаным і іншых людзей у жыта.

— Пасля цёця расказвала, як ноччу падалі побач нас асколкі ад снарадаў. Каб я не плакаў, маці давала мне ссаць палатно з кашулі. Над раніцай фронт адышоў і мы вярнуліся ў родныя Градалі, — распачынае свае ўспаміны Сяргей Лукашук. — З той нагоды, што я нарадзіўся 22 ліпеня, у дзень абвяшчэння маніфеста Польскага камітэта нацыянальнага вызвалення, некалькі разоў запрашалі мяне на святкаванні.

Бацькі Сяргея — Трафім і Анісія былі земляробамі і гаспадарылі на звыш дзесяці гектарах зямлі.

— У майго бацькі былі залатыя рукі і ён адгукаўся на просьбы сялян, якія звярталіся да яго за дапамогай. Ставіў ён печы і выконваў простыя прылады працы, займаўся сталярствам, слесарствам. Я стараўся яму дапамагаць і любоў да майстравання засталася па сённяшні дзень. Яшчэ і зараз чакаю водпуску, каб паехаць на вёску і заняцца сталярскімі працамі, — гаворыць мой суразмоўца.

У сям'і Сяргея было двух старэйшых братоў і сястра. Усе мужчыны ўмелі іграць на акардэоне. Спачатку Сяргей паступіў у Падставовую школу ў Пашкоўшчыне, дзе заўважылі яго музычныя здольнасці. Папрасілі, каб іграў на акардэоне для школьнай дзявочай танцавальнай групы.

— Мой дваюрадны брат Аляксандр вучыўся ў Педагагічным ліцэі ў Бельску. Я рашыўся туды паступіць, бо ў ліцэі вучылі іграць на музычных інструментах, — успамінае Сяргей.

У ліцэі вучыўся ён іграць на скрыпцы, а на акардэоне іграў у Калектыве песні і танца „Падляшша" і невялікай капэле, якая выступала на школьных мерапрыемствах. Сваю прафесійную работу распачаў у 1964 годзе ў Падставовай школе ў Межвіне, дзе быў, між іншым, настаўнікам музыкі. Пасля некалькіх месяцаў працы быў прызваны ў войска і там іграў у музычных калектывах. У 1966 годзе стаў дырэктарам Падставовай школы ў Галадах і займаўся там з музычным калектывам. Праз год запрапанавалі яму акампаніраваць на акардэоне хору Бельскага аддзела БГКТ, якім кіраваў Юрый Шурбак. З 1970 па 1990 год кіраваў беларускім хорам, які з 1973 года стаў называцца „Васілёчкі". Ад 1970 года працаваў кіраўніком культурна-асветнага аддзела Галоўнага праўлення БГКТ, а з верасня 1972 года стаў намеснікам дырэктара Падставовай школы н-р 3 у Бельску-Падляшскім. У 1973 годзе ажаніўся з харысткай Валянцінай. З верасня да канца 1974 года быў галоўным дырэктарам згаданай школы, а з 1 студзеня 1975 года стаў дырэктарам Бельскага дома культуры і на гэтай пасадзе працуе па сённяшні дзень. У тым часе завочна закончыў настаўніцкую школу па спецыяльнасці музычнае выхаванне і ў 1971 годзе паступіў у Музычную акадэмію ў Варшаве. Скончыў яе ў 1976 годзе з дыпломам магістра мастацтва.

— У варшаўскую акадэмію паступаў я з маім дваюрадным братам Аляксандрам. Калі экзаменатары даведаліся, што мы беларусы, прасілі заспяваць беларускія песні. Пасля мы таксама не скрывалі сваёй нацыянальнасці. Польскія выкладчыкі не рабілі нам ніякіх перашкод, а наадварот, гаварылі з намі пра беларускую музыку і дырыжораў. У тым самым часе кіраваў я хорам „Васілёчкі" і, падбіраючы рэпертуар для бяльшчан, кансультаваўся з варшаўскімі выкладчыкамі, — успамінае Сяргей Лукашук. — Палова васьмідзесятых гадоў, гэта самы лепшы перыяд у дзейнасці хору „Васілёчкі". Калі ў 1987 годзе выступалі мы для беларускага тэлебачання, было ў нас каля 40 харыстаў і 7 музыкантаў у інструментальнай капэле. У 1990 годзе на рэпетыцыі стала прыходзіць мала людзей і я рашыўся пакінуць кіраванне хорам. Думаю, што разам з харыстамі „Васілёчкаў" пакінулі мы для беларускай культуры немалую спадчыну.

У гэтым самым годзе Сяргей Лукашук заснаваў новы калектыў „Маланка", якім кіруе па сённяшні дзень. З 1976 года кіруе калектывам „Дзявочыя ноткі" ў бельскім белліцэі, а ў мінулым апекаваўся „Крынічкай" і „Іскеркамі". У 1983 годзе арганізаваў у бельскай „тройцы" дзявочы калектыў „Нашыя дзеці", пасля вёў калектывы „Жучкі" і „Лявоны". У „Нашы дзецях" і „Дзявочых нотках" спявала дачка Сяргея — Іаанна, а ў „Лявонах" акардэаністам быў сын Тамаш. З 1992 года калектыў бельскай „тройкі", якім таксама кіруе спадар Лукашук, называецца „Журавінка". У мінулым годзе была выдадзена аўдыёкасета і кампакт-дыск бельскага калектыву „Вочы дзяцей". Харысты з „Маланкі" пад кіраўніцтвам Сяргея Лукашука выдалі 6 аўдыёкасет з беларускімі песнямі, у тым ліку адну з беларускімі калядкамі і адзін кампакт-дыск. Калектывы, якімі кіруе Сяргей Лукашук, часта перамагалі ў конкурсах беларускай песні і далі многа канцэртаў. „Маланка" вельмі паспяхова выступала па-за межамі Беласточчыны і Польшчы.

— Трэба многа шукаць, каб знайсці рэпертуар для дзяцей, моладзі і дарослых, які падабаўся б ім. Дома многа часу займае падборка матэрыялаў і іх апрацаванне. Радуюся, калі пасля працы відаць рэзультаты. Дапамагае мне інструктар Бельскага дома культуры Юстына Пажазінская, прафесійна падрыхтаваная да працы з салістамі і эстраднымі калектывамі, — кажа Сяргей Лукашук. — Апошнім часам былі ахвотныя запісацца ў „Маланку", але рашыліся мы не разбудоўваць калектыў (зараз у ім 10 вакалістаў і 7 музыкантаў.

Мой суразмоўца ад амаль 30 гадоў паспяхова кіруе Бельскім домам культуры. За гэты час звыш 20 разоў былі арганізаваны Дні Бельска. У доме культуры зараз працуе 15 пастаянных гурткоў і калектываў, якія займаюцца мастацтвам, спевам, танцам і тэатрам. Апошнім часам дом культуры арганізаваў многа беларускіх мерапрыемстваў, у тым ліку „Спасаўскія запусты" — разам з бельскім аддзелам БГКТ. На працягу апошняга года БДК наладзіў 240 мерапрыемстваў, у якіх прынялі ўдзел каля 40 тысяч асоб. Спадар Лукашук актыўна дзейнічаў у самаўрадах Бельска і Бельскага павета. Зараз з'яўляецца павятовым радным.

Сяргей Лукашук з хорам „Васілёчкі" (злева жонка Валянціна)

Сяргей Лукашук за сорак гадоў прафесійнай, мастацкай і грамадскай работы атрымаў шмат узнагарод, а сярод іх медалі Залаты крыж заслугі і Кавалерскі крыж Ордэна адраджэння Польшчы, адзнакі „Заслужаны Беласточчыне" і „Заслужаны дзеяч культуры".

— Калі б яшчэ раз трэба было выбіраць адукацыю, ізноў выбраў бы музыку, — гаворыць на заканчэнне спадар Сяргей. — Мае дзеці цікавяцца тым, што і я. Закончылі яны музычныя школы і нядаўна падрыхтавалі для „Дзявочых нотак" песню „Верны друг", дзе словы напісала дачка Іаанна, а музыку склаў сын Тамаш. Абое любяць, таксама, займацца сталярскімі работамі.

Аляксей Мароз

Сяргей Лукашук з дзяўчатамі з Падставовай школы ў Пашкоўшчыне

Сустрэньмася ў беларускай хаце

У „Ніве” н-р 15 ад 11 красавіка г.г. маю ўвагу прыцягнуў артыкул „Абяцанкі-цацанкі” (мх). Прачытаўшы яго пару разоў я моцна над ім задумаўся. Спадара Сакрата Яновіча я ведаю як выдатнага беларускага пісьменніка, літаратурныя дасягненні якога дацаніў сам прэзідэнт Аляксандр Кваснеўскі ўручыўшы яму ў мінулым годзе прэстыжную ўзнагароду імя Анджэя Дравіча.

Падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі і старшыня падляшскага сейміка Збігнеў Кшывіцкі пасля гэтай падзеі наведалі Сакрата Яновіча з віншаваннямі ў яго доме ў Крынках. Пры нагодзе сустрэчы маршалак Кшыжэўскі здакляраваў фінансавую дапамогу ў выданні гістарычнай кніжкі „Пад знакамі Арла й Пагоні”. Але, як пазней аказалася, на дакларацыях толькі закончылася. Грошай на выданне кніжкі Яновіч не атрымаў (а справа была ў 4-5 тысячах злотых). Мне здаецца, што Я. Кшыжэўскі і З. Кшывіцкі гэта разумныя палітыкі ды адказныя працаўнікі ваяводскай самаўрадавай управы, але тут паявілася адно „але”, якое, відаць, не спадабалася Яну Сычэўскаму, члену маршалкоўскай управы адказнаму за культуру ў рэгіёне і заадно старшыні Галоўнага праўлення БГКТ. Як вынікае з артыкула — так прынамсі я гэта зразумеў — ён, мабыць, перашкодзіў спансараваць выданне Яновічавай кніжкі, за якую заплаціў сам аўтар, і адчуў сябе пакрыўджаным цераз так высокапастаўленую ваяводскую ўладу. А спадар Сычэўскі думае, што толькі ён з'яўляецца сейбітам беларускай культуры і ён павінен усім што беларускае кіраваць.

Некалькі гадоў таму я прапанаваў праз пасрэдніцтва „Нівы” ўсім беларускім дзеячам у Польшчы сустрэцца на нейтральным грунце і паабяцаў адпусціць сваю хату, каб толькі ўсе паядналіся і жылі ў згодзе. Аднак на мой заклік ніхто не адгукнуўся. Думаю, што і цяпер было б яшчэ не позна ўсім спаткацца, толькі ці я адпушчу цяпер сваю хату? Яшчэ трэба задумацца над тым.

Мікалай Лук'янюк

Гайнаўскія парадкі

Самаўрадавыя ўлады на чале з бурмістрам Гайнаўкі шмат увагі прысвячаюць эстэтычнаму выгляду гэтага звыш 20-тысячнага горада на ўскраіне Белавежскай пушчы, асабліва яго цэнтральнай часткі.

Ліквідавалі па некалькі старых і непрыгожых, пераважна драўляных дамоў, між іншым, па вуліцах 3 Мая, кс. Ігнацыя Верабея і Стэфана Баторыя. Зараз зносяць дашчэнту выэксплуатаваныя жылыя дамы па вуліцы Стэфана Баторыя і ў пачатку вуліцы Грунвальдскай.

Ліквідацыя старых адслужаных будынкаў магла б ісці больш шпаркім тэмпам калі б, вядома, было дзе высяліць пражываючых у іх людзей. **(яц)**

У Арлянскай гміне няма каналізацыйнай сеткі. Ачышчальні ёсць толькі ў пасляпэгээраўскім пасёлку ў Дыдулях і ў Орлі, у якой сцёкі паступаюць толькі са школы; абедзве ачышчальні змагаюцца з клопатамі...

Арлянскія клопаты

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Вадакачка ў Орлі, для якой сёлета прадбачваецца вонкавы рамонт

Мінулы год Арлянская гміна закрыла задоўжанасцю бюджэту ў 400 тысяч злотаў. Да канца гэтага года гміннае самакіраванне плануе давесці яе да 850 тысяч і пачаць новыя інвестыцыі. На 2004 год план прыходаў гміны роўны 4 817 318 злотаў, а расходаў — 5 509 тысяч, з чаго на асвету і выхаванне прызначана 1 517 тысяч ды на адміністрацыю 804 344 зл. Кіраўніцтва гміны чакае адказу з еўрасаюзнага фонду SAPARD наконт першага этапу пабудовы каналізацыйнай сеткі ў Орлі і будовы вуліцы Партызанаў.

Арлянская гміня, якая ахоплівае 22 салэцтвы, стопрацэнтна забяспечана водаправодамі, а ў 92% вёсак пакладзены асфальтавы насціл. Насельніцтва забяспечваецца вадою з дзвюх вадакачак: у Орлі і Алекшах; у апошняй найлепшая ў рэгіёне вада і там паўстае прадпрыемства прадукцыі напіткаў і фруктава-гароднінны завод.

У Арлянскай гміне няма каналізацыйнай сеткі. Ачышчальні ёсць толькі ў пасляпэгээраўскім пасёлку ў Дыдулях і ў Орлі, у якой сцёкі паступаюць толькі са школы; абедзве ачышчальні змагаюцца з клопатамі.

Ачышчальня ў Дыдулях з прапускною здольнасцю ў 23,1 кубаметра ў суткі мае дазвол на дзейнасць да 5 верасня 2005 года. Ачышчаныя сцёкі, якія часта не трымаюць заданых параметраў, адводзіць яна непасрэдна ў меліярацыйны роў. Падляшскі ваяводскі інспектар аховы асяроддзя спаганяе фінансавыя кары за неадпаведны водна-юрыдычнаму дазволу адвод сцёкаў у зямлю або ваду.

Гмінная ачышчальня сцёкаў у Орлі была здадзена ў карыстанне ў снежні 1992 года разам з новым школьным будынкам. Яе магутнасць — 150 кубаметраў у суткі — дазваляла ачысціць усе сцёкі з мястэчка. Аднак не магла яна іх ачышчаць, бо самаўрад „забыўся” пракласці да яе каналізацыйную сетку. Не маючы пастаяннага прытоку вадкіх нечыстот (ад школы паступала 15 кубаметраў, а ў час канікул — нічога), яна часта цярпела аварыі і з ліпеня 1999 года да 2003 года не выкарыстоўвалася з прычыны зношанасці помпаў. Тагачасныя гмінныя ўлады не турбаваліся гэтым і не спяшалі з яе рамонтам, пакуль справай ачышчальні не зацікавіўся Ваяводскі інспектарат аховы асяроддзя, які загадаў ліквідаваць зліванне сцёкаў на гмінную звалку каля Орлі. З таго часу праз некалькі гадоў сцёкі збіралі ў прыёмны рэзервуар непрацуючай ачышчальні і вывозілі ў камунальную ачышчальню ў Бельск-Падляшскі. І па сённяшні дзень — хаця арлянская ўстаноўка ўжо змадэрнізавана — з асабняцкіх рэзервуараў сцёкі вывозяцца ў Бельск і гаспадару за адзін курс машыны прыходзіцца плаціць па 50 злотаў. Новая біялагічная ачышчальня ў Орлі ў выніку няправільнай эксплуатацыі, без адпаведнага ўтрымання біялагічнага рэсурса пры малым і нерэгулярным прытоку сцёкаў, аказалася змарнаванай інвестыцыяй. Яе мусова было ладзіць дзеля функцыяніравання школьнага будынка, а і пасля рамонту яна зноў будзе псавацца без даставак з каналізацыйнай сеткі. І так, як гаворыцца ў народзе, калі раз добра не падумаеш, тады два разы траціш.

Ачышчальню ў Орлі змадэрнізавалі з біялагічнай на біялагічна-механічную ў 2001-2003 гг. коштам у 1 708 525 злотаў, з чаго крэдыты і пазыкі склалі 850 тысяч. Цяпер праходзіць уступная эксплуатацыя аб'екта. Згодна праектным палажэнням прапускная магутнасць ачышчальні можа быць павялічана да 42 кубаметраў у суткі, а ў перспектыве і да ста.

Пра пабудову каналізацыйнай сеткі ў Орлі гаварылася ўжо даўно, але толькі гаварылася. Гмінныя ўлады былі перакананы, што жыхары мястэчка адмовяцца, калі ад гаспадара запатрабуецца даплата парадку ў паўтары тысячы злотаў. Апытанне высветліла, што ахвотных на каналізацыю каля 70% жыхароў. Такім чынам пракладка каналізацыі ў Орлі вырасла ў ранг неабходных і пільных мерапрыемстваў, што з прычыны задоўжанасці гміны вельмі ўскладняе сітуацыю. Надзея і шанс рэалізацыі інвестыцыі — у фінансавай падтрымцы папулярным еўрасаюзным фондам SAPARD. Арлянскі самаўрад пракладку каналізацыі на некаторых вуліцах увёў у план сёлетніх інвестыцыйных задач. Інвестыцыя праводзілася б за кошт крэдытаў і пазык вартасцю 482 474 зл. і магчымай незваротнай датацыі з фонду SAPARD вартасцю ў 524 474 зл. Калі датацыя будзе, тады першым этапам пракладкі каналізацыйнай сеткі будуць ахоплены вуліцы Бельская, Крывая, Канапніцкай і Міцкевіча. Арлянская заяўка на датацыю апынулася на 19-м месцы ў чарзе з ліку 36-ці.

* * *

Выкрыць недарэчнасці ў Арлянскай гміне — справа нескладаная. Раней дастаткова было прыглянуцца ачыстцы сцёкавых вод, а цяпер парадку падабраных для каналізацыі вуліц. І так, напрыклад, ачышчальня знаходзіцца пры вуліцы Сянкевіча, але для пракладкі першага этапу гэтая вуліца не прадбачана, хаця яна мае натуральны нахіл і не трэба было б для яе дарагіх насосаў — было б танней ды і лягчэй атрымаць еўрасаюзныя сродкі. Відаць, на гэтым арлянскаму самаўраду не залежыць.

Міхал Мінцэвіч

Гродзенскія дэпутаты на Падляшшы

У рамках супрацоўніцтва паміж Гродзеншчынай і Падляшшам у днях 29-30 красавіка г.г., па запрашэнні маршалка Падляшскага ваяводства, наш рэгіён наведала дэлегацыя дэпутатаў Гродзенскай вобласці. Мэта візіту — абмеркаванне супрацоўніцтва паміж Гродзенскай вобласцю і Падляшскім ваяводствам і яе новых абумоўленасцей у кантэксце далучэння Польшчы да Еўрасаюза.

У ходзе візіту госці сустрэліся з прадстаўнікамі Беларускага грамадска-культурнага таварыства, Беларускага саюза і „Нівы”, якія паінфармавалі гродзенскіх дэпутатаў аб найважнейшых праблемах беларускай нацыянальнай меншасці. Закраналіся, між іншым, справы дапамогі беларускім самадзейнікам, Беларускаму музею, абмену моладдзю, дасканалення настаўнікаў беларускай мовы, кнігаабмену. Паколькі цяперашняе супрацоўніцтва з Гродзеншчынай мае камерцыйную аснову, прапанавалася звязаць яго з культурай беларускай нацыянальнай меншасці Беласточчыны.

— Сёння мы паслухалі і бачым на самай справе, што мы, дэпутаты, павінны больш увагі ўдзяляць нашым кантактам і тым пытанням, якія вамі ўзнімаюцца, — здакляраваў Аркадзь Карпуць, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў.

Старшыня аблсавета паведаміў таксама, што да канца гэтага года ў Свіслачы завершыцца будова тэлевышкі, дзякуючы якой будзе можна прымаць Беларускае тэлебачанне ў шырэйшай паласе, чым дагэтуль.

Гродзенскія госці наведалі Гайнаўку і Белавежу ды ўдзельнічалі ва ўрачыстым адкрыцці байдарачнага паходу па Аўгустоўскім канале і Нёмане. **(вл)**

У вялікай мураванцы можа памясціцца з 12 асоб. Жылі і жывуць тут будаўнікі дарогі ў Баброўнікі, мытнік, якога перакінулі з-пад іншае мяжы, прыязджаюць людзі з усяе Польшчы...

У яе хаце начавалі Каралі раёна

Хата звычайная, мураваная. У Гарадку, па вуліцы Беластоцкай, 132. За сцежкамі, атуленымі брукам з каляровых брускоў, за шматпавярховай мураванкай, аколенай буяючымі кветкамі — кволая жанчына, маці, удава, якое дробныя далоні змагаюцца з брукам і іголкай, для іх — „рок-мама". Маці пагранічніка Марка і Дароты, у моцнай хаце, у якой знаходзяць прытулішча басякі і рокмены, і будаўнікі цвёрдай дарогі з Еўропы на Усход. Мірка Антановіч — дзяўчына з таго пакалення, якому здаецца, што яны — паміж дзядамі, якіх кранула Гісторыя, а дзецьмі, якія ўваходзяць, робячы бакамі, у Еўропу. Яна, стомленая дробная жанчына з віхрастым чубком, якая ў цяжкай працы забывае, што яна — перш за ўсё — прыгожы парастак працавітых, больш за пяцьсотгадовых Меляшкоў, адкуль яна са старога роду Кастэнчыкаў. А хату паставіла такую, адна, бо муж ейны Язэп памёр дваццаць гадоў таму.

Міраслава Антановіч

— Трэба неяк жыць. За ўсё бралася, — кажа Міраслава, апранутая па-хатняму, крыху па-спартыўнаму — набегалася за ўвесь дзень, бо работы шмат падвесну. Калісь прымала грыбы і ягады, рабіла ў масарні, займаюся балонамі з газам, і цяпер, вось, з дачкою разам, ад чатырох гадоў вяду агратурыстычную гаспадарку. Якая была задума раней? Мець свой дом, радзіну. А трэба было. Дом будавала вялікі. Але сын-пагранічнік пайшоў на сваё, і я рашыла „рабіць бізнес".

У вялікай мураванцы можа памясціцца з 12 асоб. Жылі і жывуць тут будаўнікі дарогі ў Баброўнікі, мытнік, якога перакінулі з-пад іншае мяжы, прыязджаюць людзі з усяе Польшчы.

— Чым можна людзей у Гарадок прыцягнуць? Грыбы, ягады, вада, чыстае паветра... Звычайным здаровым жыццём. Прыязджалі з Мендзыжэча, Варшавы, Шчэціна, Кракава... Адны ходзяць пешшу па ваколіцы, іншыя — на веласіпедах. Наведваюць усё з дакладнымі картамі, дзе ўсе закуткі азначаны, нават урочышчы. Як рушаць, бывае, дык вечарам вернуцца. Вазіла я іх па ваколіцы, паказвала цэрквы, мячэць. Гэта для іх экзотыка. І наш смак ім цікавы. „Пані Міра, як смачна! Вы нас адкармілі за гэтыя два тыдні!" Елі звычайныя, тутэйшыя стравы — смакавалі ім галушкі, печаныя каўбасы, наліснікі. Усё вясковае. Могуць і вогнішча распаліць, пасядзець у альтане, зрабіць смажаніну. Могуць заказаць ежу ў мяне, могуць і самі пакухарыць. Могуць паездзіць на конях у Пяньках. Пішуць пасля лісты, шлюць паштоўкі, заказваюць месца. Ведаюць пра нас з Інтэрнэту (уся наша група займаючыхся агратурызмам — у „Агракрэсах", міхалоўскай фірме), з рэклам. Начаваў у нас і Браян Скот, калі рабіў праграму аб беларускай меншасці. Можна жыць у мяне і ў летнай кухні, а хто там пажыве, за нядоўгі час — уласнік кватэры. Шанцуе, значыць! Што цікава, рэкламу нашаму Гарадку зрабіў тэлесерыял „M. jak miłość". Звоняць людзі, пытаюцца, дык адразу тлумачу, што гэта не той Грудэк, а беларускі Гарадок. Каб спадзяваліся атракцыёнаў, але нашых, свойскіх. А атмасфера ў нас таксама радзінная, сваяцкая.

Летам тут мора кветак. Вырошчвае гаспадыня і быліны, і аднагадовыя расліны. Не шкадуе грошай ні часу: „Люблю, каб прыгожа было, каб квітнела". Вырастаюць кветкі і на вышыванках-карцінах, над якімі карпее, аж баліць пазваночнік, управіўшыся з абавязкамі. Убачыла раз такія абразы ў знаёмай, якой вазіла рамы, і захапілася. І цяпер у яе хаце — уласная галерэя цудоўных букетаў і краявідаў, вышываных крыжыкам, хоць шмат карцін схаваных у адным з пакояў.

— А, няма чаго паказваць, — сціпла паціскае плячыма Мірка Антановіч. — О, такі бабскі занятак.

— У Меляшках, разам з сястрой Райкай, мама вышывала і спявала. Уся вёска такая, — заўважае дачка Міраславы Дарота, якая якраз выбіраецца на працу ў гатэль у Валілах. Яна па прафесіі — тэхнік-праектант моды, была настаўніцай кравецкага фаху ў школе ў Міхалове (вучні „навучыліся шыць не толькі рукавіцы", а мелі паказы сваіх праектаў), магістр эканоміі. Стаіць на фоне матчыных прац, прыгожая і маладая, і Міраслава з любасцю паглядае на свой найлепшы твор ды супрацоўніцу.

Нясе гаспадыня найлепшыя свае падарункі ад кватарантаў. Касеты ад „Нейра Дзюбеля", „Крамбамбулю" ад Лявона Вольскага, візіткі, аўтографы, запіскі, нейкія чарадзейныя сувеніры ад беларускіх рокменаў, каб бізнес развіваўся.

— Жыву блізенька Барыку, чую рок! — падсумоўвае Мірка Антановіч, гаспадыня вялікага дому. Нарадзіла дзяцей, выгадавала тысячы раслін, паставіла той дом.

Міра Лукша

Не цікавяцца чыгункай

28 красавіка г.г. адбылася X сесія Рады гміны ў Чаромсе, у ходзе якой радныя адобрылі працу войта за мінулы год. Як паведаміла радная Тамара Шыкула, старшыня Рэвізійнай камісіі, кантролем былі абняты гмінная камунальная гаспадарка і асяродак сацыяльнай дапамогі. Камісія не выявіла сур'ёзных парушэнняў у працы кантраляваных устаноў. Радныя аднадумна павысілі зарплату войту на 40 зл., якая ад 1 мая складзе суму 6 080 зл. брута.

У інтэрпелацыях радны Ежы Анушкевіч пытаўся, калі пагранічнаму пераходу ў Полаўцах будзе нададзены статус міжнароднага. Анджэй Янушчык узняў пытанне перамяшчэння прадшколля ў будынак школы. Радны аргументаваў, што немэтазгодна рамантаваць прадшколле, калі будынак школы мае свабодныя залы. Радная з вёскі Чаромха Зінаіда Ляўчук звяртала ўвагу на бяздомных сабак, якія ствараюць пагрозу кліентам мясных крамаў.

Адказваючы на інтэрпеляцыі, войт заявіў, што за змену статуса перахода ў Полаўцах на міжнародны гміна хадайнічае ў Варшаве ад даўжэйшага часу, пакуль безвынікова. Наконт сабак кіраўнік гміны і гэтым разам аказаўся бездапаможным, паколькі ў прытулку для звяроў няма свабоднага месца. Адносна прадшколля і рамонту дарог адказвалі дырэктары школы, прадшколля і гміннай камунальнай гаспадаркі. Школа адмовілася ад рамонту будынка, паколькі прызнала, што гэтыя грошы можна выкарыстаць на важнейшыя мэты. А справу прадшколля разгледзіць спецыяльная камісія, якая вырашыць справу яго перамяшчэння.

У сесіях Рады ўдзельнічаюць жыхары Чаромхі. Надзея Суліма, старшыня таварыства „Прыязны транспарт", абвінаваціла радных і працаўнікоў дзяржаўнай чыгункі, што мала цікавяцца лёсам чыгуначных ліній Чаромха — Беласток і Чаромха — Гайнаўка — Цісоўка, паколькі існуе пагроза, што іншыя самаўрады Падляшскага ваяводства актыўна пахадайнічаюць і пяроймуць абяцаны Чаромсе Маршалкоўскай управай рэйкавы аўтобус. Старшыня Рады гміны Ян Купрыцюк звярнуўся з заклікам да радных, каб па меры магчымасці аказалі Таварыству падтрымку ў справе чыгуначных ліній.

У пасяджэнні Рады ўдзельнічаў дырэктар Гайнаўскага ЗОЗу Рыгор Тамашук.

— Асноўнай праблемай Чаромхаўскага асяродка здароўя, — заявіў дырэктар, — з'яўляюцца надта высокія стаўкі арэндной платы за памяшканні Прадпрыемству чыгуначнай маёмасці. Таму разглядаемся за новым памяшканнем і перасяленнем асяродка. Дагэтуль прыязджаюць спецыялісты з Гайнаўкі. Не плануем у бліжэйшы час адмяняць іхняга прыезду. Але можа быць такое, што дзеля эканоміі можам адмовіцца ад арэнды і тады спецыялісты не стануць прыязджаць. За тры месяцы гэтага года Гайнаўскі ЗОЗ выдаў 1 300 тыс. зл. Лічым, што НФЗ верне кошты, спадзяемся таксама на фінансавую падтрымку гмінных самаўрадаў, — заявіў у заканчэнні выступлення дырэктар Тамашук.

Уладзімір Сідарук

Генеральны консул Леанід Каравайка абяцаў удзельнікам экскурсіі бясплатныя візы...

Дыпламаты дзецям

Больш за сто кніжак падаравала Генеральнае консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку Пачатковай школе н-р 4, у якой навучаецца беларуская мова.

— Гэта для нас істотная дапамога, — кажа настаўніца Аліна Ваўранюк. — Тое, што маглі даць дзецям самі бацькі, яны зрабілі: адрамантавалі залу, дапамаглі яе мэбляваць, падаравалі школьныя прылады, камп'ютэр, тэлевізар, магнітафон. Не хапала нам кніжак, а я заўважаю штораз больш шае зацікаўленне маіх вучняў беларускай дзіцячай літаратурай: вершамі, казкамі, цікавымі расказамі пра іх аднагодкаў. Думаю, што кніжкі, падараваныя нам Генконсульствам, зацікавяць дзяцей і дапамогуць ім лепш авалодаць беларускай мовай. А арфаграфічныя і тлумачальныя слоўнікі, — кажу гэта як настаўніца, — на ўроках неабходныя.

Дзеці спаткаліся з беларускімі дыпламатамі ў Генеральным консульстве 5 мая. Разам з вучнямі ПШ н-р 4 былі там таксама дашкольнікі з Дзіцячага садка н-р 14. Настаўніцам садка Пасольства Рэспублікі Беларусь у Варшаве падаравала вышываныя кашулі.

— Гэтае прадшколле нам асабліва блізкае, — гаварыла ў час сустрэчы Наталля Латушка, жонка беларускага пасла, — бо калі мы працавалі ў Беластоку, хадзіла туды наша дачка. Яна ўспамінае садок вельмі цёпла і карыстаецца кожнай нагодай, каб адведаць сваіх настаўніц. Прыемна, калі дзеці маюць такія ўспаміны з садка. Цешыць тое, што хочуць вывучаць беларускую мову. Вялікі дзякуй за гэта настаўніцам.

Наталля Латушка абяцала таксама, што Пасольства Рэспублікі Беларусь будзе фундатарам узнагароды для найлепшага па беларускай мове вучня ПШ н-р 4 у Беластоку. Такія прызы, дарэчы, Пасольства прызначае беларускім ліцэям у Бельску і Гайнаўцы.

Навучанне беларускай мовы ў Беластоку пачалося з Дзіцячага садка н-р 14. Першыя яго выпускнікі ўжо ў гімназіі. Частка з іх працягвае вывучаць мову сваіх продкаў. Сёння ў два беларускія аддзелы садка ходзіць сорак пяць дашкольнікаў. У ПШ н-р 4 беларускую мову вывучае сорак шэсць дзяцей, а ў Гімназіі н-р 7 — дванаццаць асоб.

У чэрвені школьнікі разам з бацькамі збіраюцца на Гродзеншчыну. Паглядзяць, між іншым, Мір, Навагрудак, Гродна. Будзе гэта першы выезд беластоцкіх дзяцей, якія вывучаюць беларускую мову, у Беларусь. Генеральны консул Леанід Каравайка абяцаў удзельнікам экскурсіі бясплатныя візы. Консульства дапаможа таксама кантактамі ў Гродне, дзякуючы якім атрымаецца не толькі цікавая праграма паездкі, але таксама будуць забяспечаны начлег і харчаванне. (ак)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

16 красавіка г.г. я ўдзельнічала ў раённым адборы дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова”, які адбыўся ў Гайнаўскім доме культуры. Я не заняла ніякага месца (была вялікая канкурэнцыя), аднак хачу расказаць аб гэтым мерапрыемстве.

Удзельнікі конкурсу выступілі ў трох катэгорыях: класы 0-III, IV-VI і вучні гімназій. Наймалодшых дзяцей выступіла 43, з IV-VI класаў — 44 вучняў і 22 гімназісты.

Для мяне вельмі цікавымі былі дэкламацыі наймалодшых дзяцей. З усіх удзельнікаў гэта яны найбольш запрэзентавалі свае тэатральныя здольнасці і гэтым прыцягвалі ўвагу публікі. У наступнай групе школьнікаў паяўляліся больш сур’ёзныя тэксты — гэта адносіцца і да паэзіі, і да прозы. Выступленні гімназістаў таксама адрозніваліся між сабою. Адны падабралі вясёлыя вершы ці апавяданні, іншыя — дэкламавалі тэксты закранаючыя розныя чалавечыя праблемы. Я вельмі паважаю тых удзельнікаў, якія выбралі якраз сумныя творы, бо цяжка ўразіць публіку гаворачы пра сумныя справы. Аднак я не думаю, што вясёлыя вершы ці апавяданні толькі для маленькіх дзяцей. Калі хтосьці дэкламуе ўсім сэрцам, кожным тэкстам можна трапіць да людзей.

Мае сяброўкі — Ева Мароз і Магдаліна Чыквін з узнагародамі

Трапіць да людзей

Слухаючы выступленні сваіх сяброў я звяртала ўвагу на вымаўленне, націскі ў словах і ўклад эмоцыі. Агульна ўсе вучні паказаліся добра, але некторыя больш цікава прадставілі вершы ці апавяданні.

З маёй школы, апрача мяне, выступілі пяць асоб. Дзве з іх занялі найлепшыя месцы. Магдаліна Чыквін атрымала першую ўзнагароду, а Ева Мароз — другую. У апошні час я даведалася, што ў цэнтральным адборы, які адбыўся ў Нараўцы, Магда заняла першае месца, а Ева — атрымала вылучэнне. Сардэчна віншую маіх сяброўак і жадаю ім узнагарод у будучыні.

Паўліна Ігнацюк, II „а” клас Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы

Лявон Вольскі

Паветраны шар

(рок-карона за найлепшую песню 1999 г.)

О’кей! Тут усё о’кей.
Толькі дыхаць мне з кожным днём цяжэй.
Паветра зусім няма,
Колькі ні ўдыхай — усё дарма.
Глядзець на брудны горад
І крэмзаць мемуары —
Не варта вачэй і не варта рук.
І я гляджу на зоры,
І я гляджу на хмары,
І слухаю ўласнага сэрца стук.
Прыпеў:
Падымі мяне
Па-над зямлёю,
Падымі мяне
У светлы абшар!
Падымі мяне
Над мітуснёю.
Падымі мяне,
Паветраны шар!
Ляцець, над зямлёй ляцець,
Бачыць гарады, бачыць сто дарог.
Глядзець, на мяне глядзець
Сонным позіркам будзе мой народ.
На нешта вырашацца
Прыспеў, напэўна, час!
Паветрам свабоды дыхаю я.
Унізе — сям’я ды праца
І сто неадкладных спраў,
Якія сто разоў я адкладаў.
Прыпеў...
Няхай вы казалі мне
Пра няўдзячны лёс ды пра сумны фінал,
Але бачыў неба я,
Дыхаў небам я, неба я кранаў.
Прыпеў...

Лешукі

Між Лядскай і Белавежскай пушчамі, непадалёк рэчак Нараўка і Нарва ў Нараўчанскай гміне, распаложана вёска Лешукі. Зараз пражывае тут пад 150 чалавек.

Вёска Лешукі, даўней Ільяшукі, была заснавана ў канцы 50-х гадоў XVIII ст. У іншых крыніцах гаворыцца, што вёска вельмі маладая, узнікла ў 20-я гады XX стагоддзя.

Сваю назву вёска ўзяла ад сям’і Ільяшукоў, якія былі ляўкоўскімі падданымі і атрымалі дазвол на высечку лесу. Ва ўрочышчы Ельнік пасяліўся Міхал Ільяшук са сваімі сынамі, у Воўчым Горле — Хвядор са сваёй сям’ёй, а ў Васільковым Куце — Мяцей Ільяшук з сынамі. Быў гэта пачатак вёскі, якая паўстала на мяжы фальваркаў Ляўкова і Лукі. Жыхары вёскі вызначаны былі да аховы пушчы, каб чужыя людзі не забівалі звяроў і не кралі драўніны. Яны таксама сабіралі з борцяў мёд і вазілі сваімі вазамі тавар у Каралевец, Гданьск, Варшаву і Вільню.

Да вайны пражывала ў Лешуках 350 асоб. Як і з многімі вёскамі Нараўчанскай гміны, 6 сакавіка 1942 г. адбылася яе пацыфікацыя. На досвітку нямецкія жандары з пастарунка ў Нараўцы вывезлі жыхароў вёскі ў Беласток, іх будынкі спалілі, а дабро зрабавалі.

Пасля вайны людзі вёску адбудавалі. У 1979 годзе ў ёй пражывала 400 чалавек. Гадоў 50 таму, а можа і даўней, у вёсцы была капліца. Да яе прыходзілі маліцца людзі з усёй ваколіцы. Аднойчы людзі, якія ішлі ў капліцу, пачулі як нешта задрыжэла. Калі яны наблізіліся, пабачылі, што левая частка капліцы ўзарвалася. На шчасце ніхто не быў паранены. Выявілася, што гэта ўзарвалася граната яшчэ з часоў вайны. Да сённяшняга дня захаваліся толькі руіны.

Раней у вёсцы працавала школа, аднак ад сямі гадоў яна не існуе, а вучні ездзяць у школу ў Нараўку. Ад школы застаўся толькі апусцелы мураваны будынак і невялікая сажалка, якой даўно ніхто не даглядае.

За вёскай можна пабачыць вялікі камень, які ляжыць там ад незапамятных часоў. Легенда гаворыць, што *даўно таму ў вёсцы жыў яўрэй. Амаль ніхто з ім не размаўляў, бо ўсе былі перакананы, што гэта дрэнны чалавек. Аднойчы ў вёску прыехалі незнаёмыя коннікі. Яны заходзілі ў кожную хату, кагосьці шукалі. Калі ўжо пакідалі вёску, неспадзявана ўбачылі яўрэя. Яны злезлі з коней і ўзялі яго з сабой. Не паспелі праехаць некалькі метраў, як вяскоўцы пачулі дзіўны крык. Калі паглядзелі ў бок коннікаў, пабачылі, што яны ад’язджаюць без яўрэя. Раніцай на тым месцы, дзе яны спыніліся, усе ўбачылі вялікі камень. З таго часу сярод старэйшых жыхароў існуе легенда, быццам яўрэй замяніўся ў камень і хто да таго каменя дакранецца, таго сустрэне няшчасце.*

Сабрала Рэната Зялінская

Вершы Віктара Шведа

Старанна выкупайся ў ваннай

— Ты хіба хворы, дружа мой,
З надзвычай бледным тварам.
Да лекара пайду з табой,
Даследуе хай зараз.

— У лекара я быў якраз,
Даследаваў старанна.
Маці мая дала прыказ,
Каб выкупаўся ў ваннай.

Сынок рэпеціруе гадок

— Дрэннае пасведчанне са школы
Ты сёння да бацькоў сваіх прынёс.
І бачу, што надзвычай ты вясёлы,
Падспеўваеш мелодыі пад нос.

— Ты, бацька, толькі ўслухайся, падумай,
Зусім не безнадзейны наш сынок.
У тых мелодыях так вельмі многа суму,
Што трэба рэпеціраваць гадок.

Гараскоп

Баран (21.03. — 19.04.)
Зважай, бо твой статак уцякае ад цябе. Астаешся ў задзе, а гэтак не дойдзеш да славы.

Бык (20.04. — 20.05.)
Схавай рогі. Твая маці карова не захоплена тваімі выбрыкамі. Знайдзі сабе сябра.

Блізняты (21.05 — 21.06.)
Твой брат або сястра блізнючка скажа вашым бацькам, што курыш папяросы.

Рак (22.06 — 22.07.)
Не шчыпай. Твае шчаслівыя лічбы гэта 1, 2, 3 ... бо больш не ўмееш лічыць. Твае сябры пазайздросцяць табе чырвонага колеру.

Леў (23.07. — 22.08.)
Твой розум дарасце да твайго ўзросту. Зважай на промні святла — купі заслонкі да хаты. Ад сонца могуць выступіць вяснушкі. Зважай на вагу.

Дзева (23.08. — 22.09.)
Не думай, што заўсёды будзеш паннай. Да цябе сонца таксама дойдзе — выйдзеш замуж або ажэнішся.

Шалі (23.09. — 23.10.)
Твая любоў думае, што ты калісьці паразумнееш — яшчэ перад уваходам у Еўрасаюз.

Скарпіён (24.10. — 21.11.)
У сваім жыцці мусіш пазбыцца яды, бо гэта перашкаджае іншым. Зважай, леў палюе!

Стралец (22.11. — 21.12.)
Не страляй толькі ў мяне — потым аддам.

Казярог (22.12. — 20.01.)
На сваёй дарозе, на працягу тыдня, мусіш сустрэць гаспадара з полем 30 га, інакш перастануць расці валасы на тваёй галаве.

Вадалей (21.01. — 19.02.)
Зважай, рыбы хочуць заняць тваё месца. Не дайся. Вада толькі твая.

Рыбы (20.02. — 20.03.)
Асцерагайся вады. Гэты месяц будзе без дажджу. Не утопішся. Асцерагайся лужын.

Барбара Трафімюк („Варка”)

Адмірал і яго каманда

Жалобнік

З-за вялікіх аксамітна-цёмных крылаў гэтага матылька называюць жалобнікам. І сапраўды: здалёк ён выглядае самотна. Разам з тым крылы жалобніка нібы акаймаваны сонечнымі промнямі. Перад імі нанізаны блакітныя пацеркі, падобныя на кропелькі веснавога яркага неба. Хараство — не адвесці вачэй. А вось імя мастака, што стварыў такі цуд, я не буду казаць: яно ўсім добра вядома.

Зімуе жалобнік, як і яго брат крапіўнік, у шчыліне, куды не можа залезці злюка-мароз. Падзьме вецер-веснавей — матылёк прачынаецца і пакідае схованку. У канцы сакавіка і ў красавіку ён плаўна кружыцца каля бяроз, бо надта любіць пасмактаць салодкі сок. Што ж, не дзіўна, шмат каму даспадобы бярозавік. Дарэчы, і мне таксама. Няма на свеце смачнейшага пітва, хіба кляновік можна з ім параўняць.

Потым чорна-сінія вусені, якія вывеліся з адкладзеных яец жалобнікам, нястомна грызуць маладзенькае лісце бяроз, таполяў і іншых дрэў. Канечне, яны шкоднічаюць, але трэба прызнаць — ненаўмысна. Каб акукліцца і вывесці новае пакаленне матылькоў, ім патрэбна ежа.

Намнога больш чыняць бяды маладому лесу і пракаветнай пушчы двухногія чалавекападобныя істоты. Паўсюль бачны іх чорныя сляды, зробленыя пілою і сякераю, пазначаныя горбамі смецця, жахлівымі зеўрамі выжарын, узніклых ад кінутай запалкі...

Ці не таму апрануў на сябе жалобную манаскую сутану жалобнік?

Уладзімір Ягоўдзік

Польска-беларуская крыжаванка № 20

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 16: Апалонік, Швецыя, лёс, вясна, ярмарка. Ас, шлях, авёс, песня, Пац, ар, лыч, соя, шар, акраса.

Узнагароды — запісныя кніжкі — выйгралі: **Паўліна Паскробка, Эвеліна Мяшкоўская, Паўліна Мялешка** і **Рафал Тамашук** з Дубін, **Паўліна Чурак** з Арэшкава, **Наталля Кавшук** і **Анна Раманюк** з Гайнаўкі. Віншуем!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Рэдакцыя часопіса „Школьны дэ бэст”

Калісь хацелі вучыцца

Расказвае настаўніца-пенсіянерка Марыя МАРЧУК з Дубіч-Царкоўных.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Калісь у школе была зусім іншая моладзь. У колішняй школе настаўнік быў усім — яго шанавалі, ён мог караць вучняў, трымаць дысцыпліну. Па-мойму, у даўняй школе было добра. Вучні хацелі вучыцца. Пераважна ўсе дзеці мелі кніжкі і сшыткі. Я вучылася ў розных часах — пры санацыі і саветах, немцах, а потым у „новай” Польшчы. Часам не хапала грошай на кніжкі, людзі ў вёсках пераважна жылі бедна.

Пра цяперашнюю школу я чую толькі ў тэлебачанні. Цяпер у нас дзеці б’юцца, ніхто не шануе настаўнікаў. Часам думаю пра тое, як прыйшлося б працаваць у сучаснай школе, тое пра што я чую, не паказвае яе ў добрым святле. Думаю пра вясковыя школы з сімпатыяй, у горадзе ёсць іншая моладзь, бессаромная.

Часам успамінаю гады, калі я хадзіла ў школу. Мае думкі з дзяцінства вельмі вясёлыя. Я нікога не баялася, у школе была вельмі добрая атмасфера, можна было жартаваць з настаўнікамі. Часта вяртаюся думкамі ў часы маладосці. Я штудзіравала русістыку ў Варшаве. Потым, два гады, працавала ў варшаўскай бібліятэцы. Вельмі шкадую, што тады я не зрабіла магістэрскай дысертацыі і не асталася жыць у Варшаве. Пасля вяртання я адзінаццаць гадоў працавала ў школьнай бібліятэцы ў Гайнаўцы, а потым семнаццаць гадоў — настаўніцай рускай мовы ў школе ў Дубічах-Царкоўных. У нас былі добрыя кантакты з вучнямі, мы стараліся дапамагчы ім у навуцы. Бацькі таксама аказвалі падтрымку, шанавалі настаўнікаў і, бывала, аралі нам лугі, капалі бульбу.

У школах вучылася вельмі многа дзяцей. Былі розныя класы — у некаторых былі „старыя” вучні (якія навуку пачалі пазней ад іншых). Настаўнікаў не было многа. Часам у вясковых школах працавалі адзін-двух настаўнікаў. Для старэйшых вучняў яны арганізавалі гульні і пацехі.

Думаю, што цяпер настаўнікі ўзвышаюцца, хочуць усім паказаць, што яны лепшыя за іншых. Калісь таго не было. Пасля вайны між настаўнікамі былі сяброўскія адносіны. Па-мойму, кожны чалавек заўсёды будзе добра ўспамінаць школьныя гады. Гэта час, калі многа дзеецца.

Магда Аўксеціюк
„Школьны дэ бэст” — часопіс вучняў у Дубічах-Царкоўных

Гуляюць па-беларуску

Вучні пятага і шостага класаў Падставовай школы н-р 3 у Гайнаўцы 22 красавіка выступілі перад сябрамі і настаўнікамі з абрадам „Вяселле". Раней гэтую сцэнку паказалі бацькам вучняў. Дзяўчаты і хлопцы, якія займаюцца ў беларускім гуртку, здаўна вучыліся, як выступаць перад публікай. У мінулым годзе паказалі яны сцэнку „Сваты", а пасля вывучылі народную вопратку і беларускія стравы.

На мерапрыемства вучні разам з настаўніцай беларускай мовы Марыяй Крук, якая апякуецца тэатральным гуртком, падрыхтавалі прыгожую сцэнаграфію. Вышываныя ручнікі, макаткі, абрусы і посцілку ўзялі са школьнага беларускага куточка і прыватнай калекцыі настаўніцы. Старыя саяны, блузкі і кашулі шукалі вучні ў сваіх бабуляў па падгайнаўскіх вёсках. Многа рэквізітаў прывезла Марыя Крук, якая таксама спякла каравай.

Пастаноўка „Вяселля" распачалася са сцэнкі ў хаце маладой дзяўчыны. Сяброўкі маладой апранулі яе ў народную вопратку і прымалі гасцей маладога, што заехаў па дарозе ў царкву. Моладзь паказала абрад „успамагання" і момант развітання з бацькамі. Пасля вяртання маладой пары з царквы быў арганізаваны пачастунак і вясельныя танцы. Вучні адважна выступалі перад публікай. Добра гаварылі на беларускай мове і цікава паказалі беларускія традыцыі. Прадстаўленне спадабалася вучням і настаўнікам, якія моцна апладзіравалі пасля выступлення. Моладзь пахваліла кіраўнік аддзялення па справах культуры Гарадской управы Яўгенія Марчук.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вучні выступілі ў даўняй вопратцы, якая захавалася ў вясковых куфрах

— З вясельным абрадам мы пазнаёміліся раней. Ён захаваўся на вёсках, дзе пражываюць нашы бабулі, — паінфармавалі выступаючыя на сцэне хлопцы. — У нас арганізуюць падобныя пачастункі і кідаюць грошы на „ўспамаганне".

— Выступленне перад сябрамі — для нас вясёлая гульня. Мы развіваем свае зацікаўленні і можа заахвоцім іншых вучыцца беларускай мове, — заявілі дзяўчаты.

— Нам падабаюцца вясковыя вяселлі з народнымі абрадамі. Зараз маем нагоду пазнаёміцца з беларускай культурай, абрадамі і традыцыямі, — патлумачылі іншыя вучні.

У Падставовай школе н-р 3 у Гайнаўцы вучыцца 107 асоб. На заняткі беларускай мовы ходзіць звыш 50% дзетак (52 вучняў з другога па шосты клас). Юстына Тарасевіч стала ў гэтым годзе лаўрэаткай прадметнага конкурсу па беларускай мове. Апошнім часам у конкурсе беларускай гавэнды Эвеліна Назарук заняла другое месца, а Юстына Тамашук — трэцяе.

— На ўроках беларускай мовы мы карыстаемся не толькі падручнікамі. Арганізую многа гульняў, якія падабаюцца вучням. Гуляем у кандуктара, павучка, знаёмімся з садавінай і агароднінай. Рысуем, спяваем, дэкламуем вершы і многа чытаем, — кажа Марыя Крук. — Здараецца, што вучні просяць, каб дзеля перапынку я заспявала ім беларускую песню. Я і спяваю ім на заказ. Гімнам на нашых занятках з'яўляецца песня „Люблю наш край, старонку гэту". Чытаем таксама „Ніву", звяртаючы асаблівую ўвагу на артыкулы ў „Зорцы".

— У нас вельмі добрая настаўніца беларускай мовы. Школа невялікая, але бяспечная, — інфармуюць Юстына Тарасевіч і Паўліна Лапінская.

— Мне падабаюцца экскурсіі ў лес, чытанне цікавых расказаў і спяванне песень, — гаворыць Радаслаў Дзмітрук. Усе вучні, якія паказалі беларускае прадстаўленне, хочуць ісці вучыцца ў гайнаўскую белгімназію.

— Заняткі беларускай мовы вядуцца за сцяной майго кабінета і я чую, як вучні ангажуюцца ў заняткі і выказваюць сваю радасць. Відаць, што настаўніца Марыя Крук умее іх зацікавіць. Папярэдняя настаўніца беларускай мовы Вольга Сянкевіч таксама ўмела заахвоціць дзетак да вучобы, — гаворыць дырэктар школы Галіна Пустэльнік.

У беларускім куточку была наладжана выстаўка велікодных яек, ручнікоў і макатак. У будучыні Марыя Крук хоча перамяніць адну залу ў васільковы кабінет беларускай мовы.

Аляксей Мароз

Беларусы Манрэалю

Апошнім часам мне пашанцавала пазнаёміцца з беларускім асяроддзем Канады. Зусім выпадкова, у слаўным мясным магазіне „Славенія", што па вуліцы Сен-Ларэн у Манрэалі, папала мне ў рукі рускамоўная газета „Монрэаль-Таронта". Там і знайшла я запрашэнне ўсім беларусам прыйсці ў нядзелю, 15-га красавіка, ва ўкраінскую царкву святкаваць 86-ую гадавіну абвяшчэння незалежнасці Беларусі. Запрашэнне вельмі інтрыгуючае: я даўно, але безвынікова, шукала ў Канадзе беларускамоўных эмігрантаў, марыла нават спаткаць выхадцаў з-пад Гайнаўкі ці з-пад Бельска, а нават выпускнікоў майго Лінгвістычнага універсітэта ў Мінску. У нядзелю, у царкве на бульвары Росемонт сабралася маленькая група людзей. З гасцямі з Атавы было нас пад сорак чалавек. Здаваліся, усе ведалі адзін аднаго. Аднак і нас, мяне і майго мужа, прывіталі з зацікаўленнем. Чакаючы адкрыцця мерапрыемства можна было аглянуць выстаўку мастака Мілевіча з Аўстраліі, прысутнага ў той дзень у Манрэалі. Прадаваліся таксама традыцыйныя гаджэты: драўляныя скрыначкі-сундучкі з Беларусі, кніжкі класікаў і газеты, а таксама беларускія ручнікі. Мерапрыемства пачалося малітвай айца Гуташа, які праспяваў, насамперш на ўкраінскай, а потым на старажытнацаркоўнаславянскай мовах малітву „Хрыстос уваскрос" і пажадаў усяго добрага беларускім сябрам. За малітвай пачуўся гімн „Магутны Божа", які прайграваўся пэўна з арыгінальнай грампласцінкі, бо гукавы запіс трашчаў як на кінафільмах 1930-х гадоў і толькі гучны спеў некалькіх прысутных выратаваў сітуацыю. Пасля гімна выступілі старшыня Згуртавання беларусаў Квебека Рыгор Храноўскі (на англійскай мове), намеснік старшыні Павел Парфенаў і старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвіла. Затым арганізатары аддалі мікрафон прысутным, якія жадалі прачытаць свае вершы, выказацца ці проста паінфармаваць пра свае справы. У пэўны момант прысутная ў зале старшыня ўкраінскай арганізацыі „Суспільна служба ўкраінців Монрэалю" Надзея Вэрты-Цахмістра звярнулася да беларусаў з віншаваннямі. На ўкраінскай мове яна сказала: „Я думала, што вы будзеце толькі пра Чарнобыль гаварыць. Я і не ведала, што вы таксама адзначаеце свята незалежнасці, як мы". Вельмі ўзрушана сардэчна пажадала „сваякам-беларусам" усяго добрага. Дарэчы, тэма Чарнобыля выклікала спрэчку, якую можна назваць канфліктам паміж старой і новай эміграцыяй. На пачатку голас узяла Франсуаз Бланк, якая расказала пра арышт прафесара Бандажэўскага. Яна паведаміла, што на наступны дзень, 26 красавіка, камітэт Бандажэўскага, якога яна з'яўляецца прадстаўніком, перадасць уладам горада Манраэля петыцыю пра ўвальненне прафесара. Папрасіла яна беларусаў быць прысутнымі дзеля аказання маральнай дапамогі. Пасля яе выступлення Івонка Сурвіла негатыўна пракаментавала планы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь вярнуць людзей жыць у забруджаную Чарнобыльскую зону. Прагучалі словы „генацыд беларускай нацыі". На гэта эмацыйна адказаў Дзмітры Самусевіч, які папракнуў эміграцыю ў стварэнні вельмі негатыўнага вобразу (іміджу) Беларусі. Ён абвінаваціў іх у пустых словах і вечным нараканні, прыпомніў поспехі беларускай хакейнай каманды і на канец паведаміў, што жыццё на Беларусі ўсё-такі лепшае чым у суседніх краінах — у Расіі і на Украіне. Уся дыскусія закончылася не вельмі прыемна. На самай справе яна здаецца не закончылася, але прарвалася. Апрача гэтага пачуліся заклікі, як не дзіўна ў адрас старой эміграцыі, каб пазбягаць трасянкі, ачышчаць родную мову, правільна гаварыць. Мерапрыемства закончылася вячэрай, на якой можна было пакаштаваць галубцоў, дранікаў са смятанай, салат з ласося. За чаркай віна адзін пажылы мужчына расказаў мне: „Ані мае дзеці, ні ўнукі не гавораць па-беларуску. Дзеці гаварылі да пяці гадоў, пакуль не пайшлі ў школу. Потым пачалі рабіць смешныя памылкі: замест «яна» скажуць «ён пайшоў у парк». Мы з жонкай вельмі з іх смяяліся і ўвесь час папраўлялі. Калі яны падраслі, заявілі, што будуць да нас звяртацца выключна па-англійску". Мабыць, прапанова ачышчання мовы не самая найважнейшая, калі не дапамагае яе захаваць.



Ася Кандрацюк (Манрэаль)

Гістарычны каляндар

14 мая

1613 — Жыровічы атрымалі Магдэбургскае права.

15 мая

1882 — нар. Уладыслаў Галубок.

1909 — нар. Язэп Найдзюк-Аляксандровіч, дзеяч заходнебеларускага вызвольнага руху, выдавец, гісторык.

1971 — у Лондане былі адчынены Беларуская бібліятэка і музей імя Францішка Скарыны.

18 мая

1910 — пам. Эліза Ажэшка, польска-беларуская пісьменніца.

1906 — у Пецярбургу была заснавана суполка „Загляне сонца і ў наша ваконца".

20 мая

1918 — пам. Карусь Каганец.

23 мая

1173 — пам. Ефрасіння Полацкая.

1967 — пам. Мікола Дзямідаў, вайсковы, грамадска-палітычны дзеяч.

25 мая

1905 — нар. Сяргей Хмара (сапр. Сіняк), беларускі пісьменнік, паэт, журналіст, выдавец.

1907 — з'езд настаўнікаў у Вільні, утварэнне беларускага настаўніцкага саюза.

1917 — пам. Максім Багдановіч.

26 мая

1926 — было заснавана беларускае літаратурнае аб'яднанне „Узвышша" (дзейла да снежня 1931).

27 мая

1900 — нар. Уладзімір Жылка, беларускі паэт.

28 мая

1881 — нар. Іван Луцкевіч, беларускі палітычны дзеяч.

1905 — першы выступ у друку Янкі Купалы (верш „Мужык" у газеце „Северо-Западный край").

29 мая

1993 — у Мінску адбыўся (працягваўся тры дні) III З'езд Беларускага народнага фронту, была ўтворана партыя БНФ.

30 мая

1927 — нар. Вітаўт Кіпель, беларускі эміграцыйны дзеяч у ЗША.

Птушкі высокага палёту

Ян Чабан з адным са сваіх твораў

Ян ЧАБАН нарадзіўся ў 1947 годзе ў Баратыншчыне. Працаваў настаўнікам мастацтваў у Шудзялаўскай гміне. Сёння жыве ў Крынках.

Любіў я прыроду, хацеў стаць лесніком. У белавежскі тэхнікум не прынялі маіх папераў, бо з нелясной сям'і. Пайшоў у педліцэй у Лапы, а пасля ў Вышэйшую педагагічную школу ў Гданьск ды потым на два гады ў Жэшаў атрымаць магістэрскую ступень. Гатовіўся да пачатковага навучання ды музычнага выхавання.

У брата быў гармонік і я малым падглядаў яго ігру, а калі хатніх не было дома, сам тайком іграў. І як мяне выкрылі, я ўжо лепш ад брата ўмеў. З пятага класа пачаў іграць на забавах. Іграў да дарасласці, з вечара да раніцы, бо грошы былі патрэбныя. Працаваў, не піў, не курыў. Маляваў, рысаваў, меў здольнасці.

Спярша напіхаў птушак. Навучыўся гэтаму сам: чытаў кніжкі, прыглядаўся птушыным чучалам у Белавежы. Як чалавек хоча, то дойдзе, а птушкі мяне цікавілі. Аднойчы тата касіў сенажаць і касой зарэзаў качку. Прынёс яе дахаты — што з ёю зрабіць? І я падумаў, каб захоўваць тых птушак. Сталі тады да мяне зносіць розных птушак, часта з браканьерства, акрываўленых. Тады кінуў я напіхаць, бо мне шкада іх такіх стала, сумленне супрацівілася. Перайшоў на разьбу.

Інспірацыяй для майго сённяшняга хобі быў часопіс „Plastyka w szkole". Паказалі там селяніна з-пад Сувалак, які з драўніны прыгожа вырэзваў птушак. Як я сам пачынаў, то часта калечыўся, амаль цэлы час хадзіў з абвязанымі рукамі пакуль навучыўся бяспечна абыходзіцца з прыладамі. А трэба было карыстацца не толькі долатам ці нажом, але і пілой ды сякерай.

Першым і галоўным рэцэнзентам маіх прац — жонка. Мае птушкі спадабаліся людзям, а я, з выхадам на пенсію ў 1997 годзе, меў чым займацца. Нашых птушак ведаю на памяць. Калі знайду забітую, доўга прыглядаюся, пакуль пахаваю. Фігуры іншых птушак вырэзваў паводле атласа, хаця на здымках не ўсё відаць. Стараюся размаляваць іх дакладна і часам гледачы мацаюць тыя фігуры, ці гэта не чучалы сапраўдных птушак.

Найбольш вырэзваю нашых, мясцовых птушак. Большасць у натуральнай велічыні, вялікіх не раблю. Бывае, што вырэзваю ў меншым маштабе, бо ж трэба часам прыстасавацца да таго, на што матэрыял дазваляе. Трымаюся рэалізму, хаця часам думаю пра абстракцыю, здараецца нешта стылізаванае зрабіць.

Асноўным маім матэрыялам — ліпа. Прабаваў разьбы і ў бярозе, але яна цвёрдая і долаты ў ёй псаваліся. А ліпа, калі высахне, цвярдзее і не трэскае. І калі хто ў наваколлі зрэжа ліпу, зараз пра мяне думае; нават з Гарадка прапанавалі. Часам, калі ногі птушак тонкія, прыходзіцца карыстацца металам, тады драўніна заслабая і трэба дроту і падпертай, напрыклад хвастом, пазіцыі птушкі.

Працую толькі летам, у майстэрні. Зімою не раблю, бо холадна, а ў хаце не хочацца смяціць. І летам езджу падглядаць птушак. З раніцы сядаю на ровар; часта пад Азяраны еду, бо там нямыя лебедзі водзяцца. І калі нейкі цікавы корань знайду, выглядаю ў ім, ці нейкая жывёла не атрымаецца з яго.

Некаторыя мае працы ёсць у беластоцкім музеі, іншыя забіраюць на выставы. Бываюць заказы, напрыклад, калі „Kurpie Zielone" ехалі ў Англію, узялі маіх птушак у якасці сувеніраў. Нядаўна запрашалі мяне ехаць на выставу ў Мілан, на паказ разьбы ў драўніне, але я адмовіў — замнога часу давялося б на гэта патраціць, адарвацца ад сваіх птушак.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Праваслаўе і беларускасць

(заканчэнне; пачатак у 18 нумары)

Праваслаўныя ў XVII ст. сталі абараняць рускую традыцыю, абычаі, культуру, мову і гісторыю — традыцыю мінулага Кіеўскай Русі.

Мяркуецца, што на бачанне гісторыі Русі — зямель сённяшняй Беларусі і Украіны — у 20-30-я гады XVII ст. паўплывалі погляды Мацея Стрыйкоўскага. Такім чынам стваральнікам асноўнай канвы новай беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі меў бы быць Стрыйкоўскі, а не „колішнія рускія летапісы". Калі б гэта была праўда, па сутнасці можна было б у вялікім спрашчэнні гаварыць у большай ступені аб рэлігійнай, чым нацыянальнай свядомасці.

Прывядзем надта красамоўны, лічу, фрагмент твора „Апраўданне невіноўнасці", у якім Мялецій Сматрыцкі піша аб узаемасувязях нацыянальнасці і веравызнання.

„Калі ж ёсць сапраўдная Русь, якія ж [людзі] маюць быць і мусяць (бо ж адразу з крыві той не выраджаецца, хто веру мяняе): калі хтосьці з рускага народу ў рымскай веры застаецца, адразу ад нараджэння іспанцам або італьянцам не становіцца, толькі па-старому застаецца шляхетным русінам. Не вера менавіта русіна русінам, паляка палякам, літоўца літоўцам учыняе, але нараджэнне ды руская, польская і літоўская кроў".

У вышэйпрыведзеным фрагменце Сматрыцкі прымяніў тэрмін „кроў" у сэнсе этнічнай супольнасці — шляхецкай, якая была таксама рэлігійнай супольнасцю. Трэба меркаваць, што Сматрыцкі не лічыў веру неабходнай або адзінай адметай нацыянальнасці.

Акрэсленне Станіслава Арахоўскага *gente Ruthenus, natione Polonus* (з роду русін, а па нацыянальнасці паляк) для гісторыкаў станавілася чымсьці накшталт ключа, пры дапамозе якога рабіліся спробы растлумачыць шматлікія складаныя з'явы, часам шукаючы неабгрунтаваных паралелей з сучаснымі ім з'явамі. Стуль, напрыклад, бярэцца ў Амвросія Жаберта акрэсленне „другасны русін" у адрас Яна Руцкага, ці ў апісанні Аляксандра Яблаўскага „толькі з роду русіны, але па нацыянальнасці ўжо палякі" ў адносінах да насельніцтва паўднёва-ўсходніх зямель Рэчы Паспалітай пасля заключэння Люблінскай уніі.

Назвай *gente Rutheni, natione Poloni* акрэсліваюць часам цэлую плеяду выдатных асоб рэлігійнага, культурнага і палітычнага жыцця Беларусі і Украіны. Былі яны прававерными грамадзянамі Рэчы Паспалітай, русінамі праваслаўнага або іншага веравызнанняў, якія пісалі па-польску, дасканала ведалі польскую і польска-лацінскую культуру і гісторыю, што, менавіта, было вынікам адукацыйнай мадэлі тадышняй Польшчы.

Кім былі інтэлектуалы таго часу? Прынялося лічыць іх творцамі польска-ўкраінскага памежжа, на якім крыжаваліся традыцыі Усходу і Захаду, сягаючыя далей, аж па Маскву. Згуртаваныя вакол Кіеўска-Магілянскай акадэміі пісьменнікі XVII ст. карысталіся польскай, лацінскай, рускай (старажытнабеларускай, старажытнаўкраінскай), царкоўнаславянскай і грэчаскай мовамі. У іх ліку былі: Лазар Баранавіч, аўтар больш пяцідзесяці кніжак, Сімяон Полацкі, адзін з выдатнейшых паэтаў беларускай, украінскай і рускай літаратур, Янікій Галятоўскі, Афанасій Кальнафойскі, Феафан Пракаповіч і шмат іншых.

Каб прасачыць усе ўзаемазалежнасці паміж веравызнаннем і нацыянальнасцю ў пазнейшых стагоддзях і ў наш час, як даказваюць працы шматлікіх выдатных гісторыкаў, акажацца, што гэтыя з'явы надта складаныя і цяжкія па многіх прычынах для аналізаў і ўсялякіх канстатацый. Балючая гісторыя не заўсёды спрыяе спакойным, пазбаўленым эмоцый аналізам.

На заканчэнне варта прывесці меркаванне вядомай польскай даследчыцы рэлігійных пытанняў на польскім усходнім памежжы Тэрэсы Хынчэўскай-Генэль. Лічыць яна, што адным з важнейшых фактараў фармавання нацыянальнай свядомасці — побач такіх чыннікаў як супольнасць мовы, гістарычнай традыцыі, тэрыторыі і інш. — з'яўляецца веравызнанне. Ніводзін з гэтых фактараў не з'яўляецца неабходнай, ні дастатковай умовай існавання нацыі і так, як сама нацыянальная свядомасць, змяняюцца яны ў сваёй сутнасці і часе.

Пятро Хомік

А вось рубрыка „Адукацыя і праца” многім маладым людзям будзе карыснай...

belarusy.com

На старонках „Нівы” ўжо неаднойчы пісалася аб беларускіх дыяспарах раскіданых па ўсім свеце. Некаторыя маюць добра функцыянуючыя арганізацыі і нават сайты ў Інтэрнэце, праз якія можна віртуальна з імі пазнаёміцца. Сёння мы зноў зойдзем на адзін з такіх сайтаў, які так і называецца „Партал беларускай дыяспары”.

Калі цікаўны карыстальнік сеціва набярэ на сваім камп’ютэры адрас http://belarusy.com, на маніторы з’явіцца прывабна афармленае выяўленне вышэйазначанага сайта. Пад яго назвай, што напісана буйнымі літарамі — малюнак зямнога шара, які без прыпынку круціцца вакол сваёй восі. Па абодвух баках ад яго знаходзяцца некаторыя рубрыкі сайта, абазначаныя адпаведнымі словамі на зялёным фоне. Ад левага боку „зямнога шара” рубрыкі пазначаны ўказальнікам „На гэтым паверсе”. Тут месцяцца, так бы мовіць, сур’ёзныя раздзелы, такія як „Навіны”, „Карта сайта”, „Форум”. Ад правага — „Папулярныя раздзелы”, якія ўключаюць у сабе рубрыкі „Галопам па Еўропам”, „Адукацыя і праца”, а таксама чамусьці зноў „Форум”.

Варта адзначыць, што на „Навіны” нават і не трэба спецыяльна клікаць, бо ўвесь іх змест ёсць на галоўнай старонцы па цэнтры ўніз ад пералічаных рубрык. Гэтая частка сайта даволі актыўна абнаўляецца, калі браць пад увагу тое, што сайт абсалютна не інфармацыйны і нацэлены, па ўсяму відаць, на патрэбы арганізацыі яго стварыўшай, г.зн. Задзіночання Беларускай Моладзі Замежжа. Навіны пачынаюцца ад чэрвеня 2003 года, калі, трэба разумець, і быў створаны сайт.

Цікавай падаецца рубрыка „Карта сайту”. Калі клікнуць на яе ўказальнік, то перад намі ўзнікае выяўленне табліцы, дзе насупраць амаль кожнай назвы рубрыкі ёсць яе кароценькае апісанне. Тое, што такое апісанне маецца не да кожнага раздзела тлумачыцца пададзеным наверсе табліцы сказам, што даная старонка знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі. Але, тым не менш, каштоўнасць гэтай рубрыкі цяжка пераацаніць, бо значна аблягчае пошукі патрэбнай інфармацыі.

Асабліва спыняцца на рубрыцы „Форум”, здаецца, не варта, хоць яна і двойчы пазначана на галоўнай старонцы. Пэўна, усім вядома, што пад гэтай рубрыкай знаходзяцца разважанні інтэрнэт-карыстальнікаў і распрацоўшчыкаў сайта па тых ці іншых праблемах.

„Галопам па Еўропам” — таксама свайго роду навіны, якія, праўда, тычацца ўсяго таго, што цікавага на думку распрацоўшчыкаў адбывалася ў краінах Еўропы. Шчыра кажучы, нямнога там інфармацый. Літаральна пяць. Па іх, зразумела, не зробіш прадстаўлення, што ж адбывалася на даным кантыненце нават за кароткі час існавання сайта.

А вось рубрыка „Адукацыя і праца” многім маладым людзям будзе карыснай. У ёй змешчана досыць цікавая інфармацыя аб працы, навучанні і жыцці ў некаторых краінах Еўропы і ЗША, выдзеленых на адукацыю замежнікаў грошай ад разнастайных фондаў.

Паверх „За бугром” утрымлівае ў сабе рубрыкі „Парады” (аб розных юрыдычных праблемах, што могуць узнікнуць за мяжой), „Культура” (аб падзеях культурнага жыцця замежных краін), „Беларусь і сусвет” (аб поглядах на Беларусь з-за мяжы), вышэйзгаданыя „Галопам па Еўропам” і „Адукацыя і праца”, а таксама „Амбасады Беларусі”. Праўда, аб апошніх даведацца чаго-небудзь немагчыма — рубрыка без аніякай інфармацыі.

Уладзімір Лапцэвіч

Кароль Швецыі даў загад вырабіць беларускаму спартсмену дадатковы залаты алімпійскі медаль...

Беларусь, беларусы...

У папярэдніх нумарах „Нівы” было расказана пра беларускіх лаўрэатаў летніх алімпійскіх гульняў за апошнія пяцьдзесят гадоў. Варта яшчэ прыгадаць імёны тых, хто спрычыніўся да алімпіядаў раней, калі беларускія землі ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі ці іх частка ў склад Польшчы.

Першай асобай з Беларусі, якая мела дачыненне да алімпіядаў быў Зыгмунт Мінейка, удзельнік паўстання 1863 года. Лёс гэтага чалавека незвычайны. Нарадзіўся Мінейка ў 1840 годзе ў вёсцы Балванішкі на Ашмяншчыне (у 1969 годзе саветы змянілі назву мясціны на Зялёны Бор). Вучыўся ў Віленскай гімназіі, пасля ў Пецярбургскай інжынернай вучэльні, ездзіў па Еўропе, у Італіі быў у шэрагах гарыбальдыйцаў. Калі на радзіме выбухнуў нацыянальна-вызвольны чын, Зыгмунт хутка вярнуўся і стаў у шэрагі паўстанцаў. У чэрвені1863 года яго атрад быў разбіты ў баі пад Расолішкамі (Ашмянскі павет), Мінейка схоплены і засуджаны да 12 гадоў катаргі. У 1865 годзе яму з Сібіры неверагодным чынам, праз усю тэрыторыю імперыі, удаецца ўцячы на захад за мяжу. Далейшы лёс гэтага няўрымслівага чалавека быў знітаваны з Грэцыяй. Тут ён ажаніўся, працаваў інжынерам, вёў археалагічныя раскопкі. Шматбаковы талент Мінейкі стаўся запатрабаваны падчас падрыхтоўкі да першых алімпійскіх гульняў сучаснасці, якія меліся адбыцца ў сталіцы старажытнай Элады ў 1896 годзе. Як і сёлета, тады пры арганізацыі спартовага форума грэцкія ўлады мелі значныя арганізацыйныя і фінансавыя цяжкасці. У шэрагах энтузіястаў-арганізатараў быў і Зыгмунт Мінейка, які ўзначальваў дэпартамент грамадскіх прац. А калі пачаліся гульні, ён перакваліфікаваўся ў рэпарцёра, пісаў артыкулы для афінскіх газет. Так што Мінейку можна назваць першым беларускім спартовым журналістам. Грэцыя высока ацаніла заслугі нашага суайчыньніка, яе парламент у 1910 годзе прысвоіў Зыгмунту Мінейку тытул пачэснага грамадзяніна краіны. Як цікавы факт варта дадаць, што ўнук Мінейкі, вядомы палітык Андрэас Папандрэу, шмат гадоў быў прэм’ер-міністрам Грэцыі, падтрымліваў алімпійскі рух.

Першым спартоўцам з беларускіх земляў, які браў удзел у выступах на алімпіядах, стаў Караль Румель, які нарадзіўся ў 1888 годзе ў Гродне. Вучыўся юнак у мясцовай гімназіі, потым у Пецярбургу ў Акадэміі мастацтваў, але ўрэшце стаў вайскоўцам. Ужо ў горадзе на Няве Румель сур’ёзна захапіўся конным спортам, а перад алімпіядай 1912 года ён быў запрошаны ў алімпійскую дружыну Расіі. Тыя гульні праходзілі ў Стакгольме. Румель выступаў у турніры па пераадоленні перашкодаў на кані. Караль рэальна прэтэндаваў на медалі, але пры апошнім скачку конь зачапіўся за бар’ер і ўпаў, моцна прыціснуўшы вершніка да зямлі. Румель здолеў узняцца і завяршыць дыстанцыю, заняўшы ў выніку толькі 31 месца. Пазней выявілася, што ў конніка зламаныя ажно пяць рэбраў. Кароль Швецыі Густаў V, які назіраў за драматычным выступам Румеля, даў загад вырабіць дадатковы залаты алімпійскі медаль. Мужны спартовец атрымаў яго ўжо ў шпітальным ложку. І гэта была хіба самая цікавая ўзнагарода ў гісторыі алімпіядаў. Была ў яго жыцці яшчэ адна алімпіяда. У 1928 годзе ў Амстэрдаме 40-гадовы Румель стаў бронзавым прызёрам у камандавым трохбор’і. У другую сусветную вайну падпалкоўнік Караль Румель удзельнічаў у баях, прайшоў два канцлагеры. Пасля вайны жыў у Сопаце, памёр у сакавіку 1967 года.

(працяг будзе)

Уладзімір Хільмановіч

Пасябравалі

Вучні і настаўнікі Сярэдняй школы н-р 32 з Гродна ад 6 да 8 мая пабывалі ў Белавежы, Гайнаўцы і Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы. Прыехалі яны па запрашэнні гайнаўскіх белліцэістаў і іх настаўнікаў, а арганізатарам мерапрыемства быў Беларускі самаўрадавы форум у РП. Вучні і настаўнікі хутка пасябравалі і гайнаўская моладзь яшчэ ў маі плануе паехаць у Гродна.

— У гэтым годзе хочам больш папрацаваць з моладдзю. Плануем дапамагчы наладзіць зносіны паміж нашымі школамі, дзе навучаецца беларуская мова і школамі з Гродзеншчыны. Ідэю, якую будзе рэалізаваць Беларускі самаўрадавы форум назвалі мы „Маладыя па-над межамі”. Шчыльная мяжа паміж Польшчай і Беларуссю не павінна спыняць міжлюдскіх кантактаў. Сустрэчы паміж моладдзю і наладжаныя кантакты дадуць плён у будучыні, — патлумачыў старшыня Форуму Міхась Андрасюк.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Пасябравалі дырэктары Мікола Байко (справа) і Яўген Сачко (на другім плане госці з Беларусі)

Моладзь з Гродна разам з дырэктарам Міколам Байко і настаўніцай біялогіі Вольгай Ахрук наведалі Свята-Троіцкі сабор ды Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы. Пасля вучні займаліся ў інтэрнэтным кабінеце і слухалі музыку. Вучнямі з Беларусі займаліся ліцэісты з II „д” класа з выхавацелькай Крысціняй Бялеўскай і іншымі настаўнікамі. Перад афіцыйнай сустрэчай госці з Гродзеншчыны пабывалі на адкрытым уроку беларускай мовы, які вёў настаўнік Ян Карчэўскі. Гайнаўскія ліцэісты-першакласнікі знаёміліся з нацыянальнымі беларускімі сімваламі — гербам „Пагоня” і бел-чырвона-белым сцягам і параўноўвалі іх з афіцыйнай сімволікай цяперашняй Рэспублікі Беларусь. Вучням з Беларусі спадабалася актыўная праца вучняў.

— Пра беларускія сімвалы я ведала, але вельмі добра, што параўналі іх з сённяшняй сімволікай. Заняткі былі незвычайнымі. Рэдка сустрэнеш такую разнароднасць на ўроку, — заявіла вучаніца з Гродна Галіна Ашмяна. — Наша моладзь прызнае гістарычныя сімвалы — „Пагоню” і бел-чырвона-белы сцяг і шкада, што яны ў нас забаронены.

— Я б сказала, што ў вас лепшая тэхнічная база для навучання. Лепшая якасць падручнікаў у плане эстэтычнага афармлення. У самым працэсе навучання і спосабе правядзення заняткаў я не бачу вялікай розніцы, — сказала настаўніца Вольга Ахрук.

Пра гісторыю гайнаўскага белліцэя і яго сучаснасць расказалі дырэктар Яўген Сачко і яго намеснік Аляксандр Лаўрыновіч, які паказаў госцям школьны будынак і гімнастычную залу. Перад вучнямі з беларускімі песнямі выступіў школьны калектыў „Знічка”. Настаўнікі і вучні абмяняліся падарункамі.

— Мяне здзівіла, што ў вашай моладзі ёсць столькі пазаўрочных заняткаў, — заявіў пасля афіцыйнага спаткання дырэктар СШ н-р 32 з Гродна Мікола Байко і запрасіў гайнаўскіх белліцэістаў у Гродна. Настаўнікі вырашылі, што візіт адбудзецца яшчэ ў маі і абмяркоўвалі план абмену моладдзю і настаўнікамі.

Вучням і іх апекунам гаспадары сарганізавалі экскурсію ў Белавежу. Паказалі ім Запаведнік зуброў і нядаўна адчынены Прыродазнаўчы музей. Пасля моладзь адпачывала каля вогнішча і ў агратурыстычнай кватэры.

— Спявалі мы песні і размаўлялі. Аказалася, што ведаем тыя ж самыя беларускія песні. Вучні падобна апранаюцца і спалучае нас тая ж самая культура, — паінфармавала настаўніца Крысцінія Бялеўская. — Лічу я, што мерапрыемства было вельмі ўдалым. Хутка знік падзел і была сямейная атмасфера. Нашы вучні вельмі добра заапекаваліся моладдзю з Беларусі.

— Спачатку было крыху няёмка. Пасля мы заўважылі, што нашы зацікаўленні падобныя і мы пасябравалі. Спадабаўся нам горад, а асабліва школа, — сказала вучаніца з Гродна.

— Большасць нашых дзяцей першы раз у Польшчы і мы хацелі, каб нашы вучні пазнаёміліся з жыццём за мяжой. Важна, што мы наладзілі кантакты з ліцэем, у якім вядзецца навучанне беларускай мове. Я хачу, каб вучні заўважылі, што беларуская мова патрэбная таксама за мяжой, — заявіла Вольга Ахрук. ***(ам-з)***

ДАВЕДНІК АГАРОДНІКА

Ад таго як выглядае газон залежыць выгляд як агарода, так і цэлага панадворка, таму варта прысвяціць крышку часу догляду муравы. Некалькі парадаў дае Віталь Семянюк — дыпламаваны агароднік.

Віталь Семянюк: — Найлепш разбіваць газон і сеяць траву ў перыядзе ад красавіка да чэрвеня і ад паловы жніўня да кастрычніка. Тады найлепшыя ўмовы для ўсходу насення, адпаведныя тэмпература і вільготнасць паветра.

Падставовай справай пры разбіванні газона з'яўляецца яго кшталт, які не павінен перашкаджаць пры кашэнні. Спецыялісты прапануюць формы нырак і авальныя па простай прычыне: навакольныя дрэвы і аздобныя кусты аптычна памяншаюць выгляд газона і перашкаджаюць у яго доглядзе.

— Як падрыхтаваць зямлю пад газон?

— Калі хочам закласці газон у месцы дзе раней быў агарод, зямлю трэба толькі перакапаць, вырваць пустазелле. Больш працы прысвяцім, калі газон мае паўстаць вакол новаўзведзенага дома. Тады зямлю трэба падрыхтаваць шляхам яе ўгнаення і выраўнання паверхні. Можам зрабіць гэта спецыяльнай машынай з катком вагою 50-70 кілаграмаў або прывязваючы да ног дзве вялікія дошкі, накшталт лыжаў і ставячы шчыльна нага пры назе трамбаваць зямлю.

— Чарговы этап — сеянне травы. Ці ён вырашае аб прыгажосці газона?

— Так. Сеючы насенне травы трэба ўлічваць указанні вытворцы, бо малая колькасць зерня на квадратны метр запаволіць рост газона, а на пустых месцах паявіцца пустазелле. А калі зерня будзе замнога, гэта давядзе да хвароб травы. Сеяць траву можна спецыяльнымі апаратамі або ўручную. Насенне трэба падзяліць на дзве роўныя порцыі і сеяць крыжавым спосабам, двойчы накрываючы плошчу газона насеннем. Пры дапамозе грабляў пакрываем насенне слоем (1-2 см) зямлі. Добра зноў утрамбаваць зямлю. Так падрыхтаваны газон паліваем, заўсёды распыленым струменем вады, аж да ўзыходу травы, а трывае гэта пераважна тры тыдні.

— А як газон касіць?

— Першы раз малады газон косім, калі трава дасягне 7-8 см вышыні, бо тады мае яна моцныя карані. Зрэзваем яе толькі на 2-3 см, і тое ж паўтараем другі раз. За трэцім разам можам устанавіць касілку на патрэбную нам вышыню, спецыялісты рэкамендуюць 5 см. Косім газон прынамсі два разы ў тыдзень. Калі дазволім траве вырасці празмерна, пры наступным кашэнні на газоне паявяцца жоўтыя плямы па прычыне недахопу сонца ў ніжніх слаях, якія стануць зялёнымі на працягу 3-4 дзён.

— Многа гаворыцца аб угнаенні. Ці яно сапраўды так важнае?

— Адыгрывае яно вялікую ролю пры атрыманні здаровага колеру і хваробаўстойлівасці травы. Галоўным элементам патрэбным для жыцця раслін з'яўляецца азот. Яго недастатак спрычыняецца да запавольвання росту і жаўцізны лісцей. Газон трэба ўгнойваць пасля першага кашэння: 1,5-2 кг на 100 кв. м, а потым раз на 1,5 месяца аміячнай салетрай. Неабходна памятаць, што прытым трэба зямлю салідна паліваць. Калі прымяняюцца сродкі ў выглядзе парашку або гранул, нельга ўгнойваць пасля паліванння або дажджу, бо хімікаты прыліпнуць да лісткоў і спаляць іх. Угнойванне канчаем у палове жніўня. Пазнейшае ўгнойванне адмоўна паўплывае на марозаўстойлівасць травы.

— А як выконваецца аэрацыя?

— Праветрыванне глебы выконваецца вельмі проста — пры дапамозе вілаў, раз за разам праколваючы зямлю. Дзякуючы адпаведнаму насычэнню паветрам атрымаецца гусцейшая і роўная трава.

— На канец паліванне.

— Газон патрабуе многа вады, асабліва летам. Кожныя 2-3 дні, а ў час засухі нават штодзённа, салідна паліваем зямлю. Малады газон арошваем нават 2 разы ў дзень, а стары — калі зямля перасохне на глыбіню 3 см. Неабходна памятаць, што лепш перасушыць газон, чым давесці да яго гніцця. Жадаю поспехаў у дагляданні газона!

Паўліна Шафран-Асташэвіч

Любім святкаваць

Польшча ўжо ў Еўрасаюзе. Калі глянуць на справу з гістарычнага боку, гэта для Польшчы не першая унія, пачынаючы з польска-літоўскага пагаднення 1385 года. Па маіх падліках унія з еўрапейскімі дзяржавамі, якую давёў да канца урад Лешка Мілера, пятая па чарзе. З гэтай нагоды ўся краіна святкавала ажно тры дні.

Але нагодай для трохдзённага адпачынку было не толькі далучэнне Польшчы да Еўрасаюза. 1 мая адзначалася таксама як Свята працы. Дарэчы, не мае працы кожны пяты грамадзянін, дык і радаваліся ім не ўсе. 2 мая выпала не толькі нядзеля, але і дзень Нацыянальнага сцяга. У гэты святочны дзень падаўся ў адстаўку ўрад Лешка Мілера, на радасць апазіцыі і большасці грамадства. А 3 мая — уся краіна адзначала Дзень Канстытуцыі.

Маю для нашых парламентарыяў прапанову наконт павелічэння колькасці выхадных дзён, паколькі за год часу месц працы пэўна не будзе больш. Добра было б, каб 4 мая ўстанавіць Днём нацыянальнага герба — Белага Арла. Тады першую гадавіну далучэння Польшчы да Еўрапейскага Саюза годна ўшануем чатырохдзённым уік-эндам.

Дзядзька Захар

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, вядзем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ДАМ ПРАЦУ

• Маладому электрамеханіку на паўштату да мантажу халадзільных і газавых установак, без злых схільнасцей, з прынамсі 2-гадовым вопытам, тэл. 741 84 28.

• Бармену з вопытам, адкрытаму ў адносінах, з фантазіяй, тэл. 0602 573 864.

• Маладым, сціплым людзям да продажу і мантажу акон, дадатковы плюс — уласная машына, тэл. 0506 083 577.

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Краўчыха з 27-гадовым вопытам, пільна шукае працу ў Беластоку, тэл. 0508 372 612.

• Механік без злых схільнасцей, з вопытам, адказны, прыме кожную прапанову працы, тэл. 0508 372 612.

• Малады мужчына, сярэдняя адукацыя, застрахаваны, уласная машына, правы кат. В, тэл. 0507 038 131.

• Малады мужчына з вопытам у гандлі, сярэдняя адукацыя, правы кат. ВС, уласная машына, абслуга камп'ютэра, тэл. 0503 111 306.

• Мужчына без злых схільнасцей шукае працу ў Беластоку, вопыт у гандлі, правы кат. В, тэл. 0606 328 132.

• Маладая жанчына з вопытам у гандлі шукае працу ў Сямятычах, тэл. 0508 626 845.

• Спрытны мужчына з ахвотай да працы, з вопытам у будаўнічых працах, чакае прапаноў, тэл. 0502 282 931.

• Студэнтка маркетынгу шукае працу ў Беластоку, стаж працы ў магазіне, добрае веданне рускай і англійскай моў, абслуга камп'ютэра, арганізацыйныя здольнасці, добры падыход да дзяцей (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0692 687 442.

• Студэнт шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, уласная машына, абслуга камп'ютэра, аператыўны, тры месяцы працы ў аптовым складзе агародніны (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0604 431 766.

• Студэнтка, 23 гады, ахвотна заапякуецца малым дзіцём у Беластоку ў ранніх гадзінах (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 744 52 93.

• Ахвотна і за невялікую цану заапякуюся малым дзіцём, педагагічная адукацыя, вопыт, тэл. 732 50 96.

• Апякунка з вялікім вопытам шукае працу ў Беластоку, тэл. 0608 025 435.

• Мужчына, сярэдняя адукацыя, правы кат. ВСЕ, ADR, пільна шукае працу ў Падляшскім ваяводстве, тэл. 0694 143 190.

• Мужчына, тэхнічная адукацыя, ахвота да працы і правы кат. В, тэл. 0505 839 632.

• Жанчына без злых схільнасцей, сярэдняя эканамічная адукацыя, шукае працу ў Бельску, тэл. 0501 948 311.

• Салідна прыбяру, смачна звару, заапякуюся старэйшай асобай, тэл. 0606 665 980.

• Маладая пенсіянерка, санітарны мінімум, фіскальныя касы, вопыт у гандлі, абслуга камп'ютэра, ахвота да працы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0693 247 833.

• Студэнт-завочнік, санітарны мінімум, кніжка здароўя, прыме кожную прапанову працы ў Беластоку, тэл. 661 40 96.

• Жанчына салідна прыбярэ кватэру, добра зварыць, тэл. 0603 620 107.

• Маладая жанчына, сярэдняя адукацыя, абслуга камп'ютэра, добрае веданне нямецкай мовы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 740 23 24.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску 730 20 06

• Пяціасабовая сям'я патрабуе пледаў і адзення для дзяцей ва ўзросце 7, 9 і 11 гадоў.

• Сям'я з 6 дзяцьмі просіць дапамогі ў выглядзе дзіцячага адзення, пасцелі і яды (кансервы, мука, цукар).

• Самотная маці з 3 дзяцьмі патрабуе старога тэлевізара, канапы і цёплай пасцелі.

• Пяціасабовая сям'я патрабуе пледаў, пасцелі і адзення для дзяцей ва ўзросце ад 5 да 12 гадоў.

• Сям'я з дзяцьмі ва ўзросце 4, 6 і 7 гадоў будзе ўдзячна за любую помач.

У Беластоку
732 01 86; 712 11 53

• Сям'я патрабуе старога халадзільніка і непатрэбнай мэблі.

• Сужонства з 4 дзяцьмі патрабуе мэблі, пасцелі, цёплых ботаў для 5- і 7-гадовых хлопцаў і 11- і 13-гадовых дзяўчат.

• Сям'я, якая выхоўвае трое дзяцей, патрабуе штаноў і лёгкіх блузак для хлопцаў ва ўзросце 10 і 13 гадоў, ботаў і адзення для 5-гадовай дзяўчынкі.

• Сям'я патрабуе помачы ў выглядзе яды (бульба, мука, мяса), гігіенічных сродкаў і старой мэблі.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры і іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Абвесткі

Прадам ужываныя ксераксы, Беласток, тэл. (+48) 888 198 934.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 600 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2004 r. upływa 5 czerwca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

„Даўціпы"
Андрэя Гаўрылюка

Загадчык загса дакарае пару маладых людзей, якія прыйшлі ўзяць метрыкі:

— Дарагія дзеткі: ці не зарана вам браць шлюб?

— Але ў нас так атрымалася, што мы хочам развесціся...

* * *

Апякунка вядзе за ручку малое дзіця. Насустрач ім ідзе пажылая жанчына і пытае:

— А чыё ж гэта такое прыгожае дзіця?

— Невядома, — адказвае нянька.

— Як гэта?

— Бо суд яшчэ не прыняў рашэння ў разводнай справе яго бацькоў.

* * *

Пісьманосец штомесяц прыносіў пажылой неадукаванай бабульцы пенсію і яна распісвалася трыма крыжыкамі. Але аднойчы падпісалася трыма колцамі.

— Адкуль такая змена? — здзіўляецца пісьманосец.

— Бо я выйшла замуж і памяняла прозвішча.

* * *

У Маскву прыехаў калгаснік на кані. Не ведаў ён правіл дарожнага руху і ўжо на першым скрыжаванні выклікаў дарожны выпадак. Ляжыць у калюжыне крыві, а побач яго конь. Прыехалі міліцыянты, высвятляюць абставіны і адзін з іх выхапіў пісталет ды застрэліў каня. Пасля падышоў да калгасніка і пытае:

— Вам нешта сталася?

— Нічагусенькі! — адказвае, схапіўшыся на зважай, — я толькі на хвілінку прылёг.

* * *

Пажылое сужонства адпачывае на пляжы. Жонка прыгадвае мужу, каб так заўзята не прыглядаўся маладым жанчынам:

— Ці так паводзіць сябе жанаты мужчына?

— Даражэнькая, калі хтосьці на дыеце, дык гэта ж не абазначае, што яму нельга глядзець у меню.

* * *

— Калі я калісь хадзіў са сваёй цяперашняй жонкай, я гаварыў, а яна слухала. Пасля шлюбу гаварыла яна, а слухаў я. Цяпер, калі на старасць жывем у будынку з бетонных пліт, гаворым адзін перад адным, а слухаюць суседзі.

* * *

Два пажылыя сябры сядзяць у кавярні. Сцвердзіўшы, што палова прысутных там дзяўчын мае на сабе шапкі або каўняры з лісоў, адзін з іх пытае:

— Што робяць гэтыя маладыя, каб мець гэтых лісоў?

— Тое самае, — адказвае сябра, — што робяць лісы, каб мець маладых.

* * *

Гутараць два агароднікі:

— У мінулым годзе па прычыне салодкіх дажджоў у маім агародзе выраслі цукровыя буракі.

— Гэта драбяза: у мяне сёлета пасля кіслых дажджоў выраслі квашаныя агуркі.

* * *

Да запрацаванага чыноўніка звяртаецца сябра з пытаннем:

— Ці ты штодзень мусіш працаваць столькі гадзін? Колькі ў цябе дзяцей?

— Не маю паняцця: калі пачаў тут працаваць, было двое.

Фота МІХАЛА КОСЦЯ

Музычныя навіны

Варашкевіч развітваецца са старой „Крамай" (фота). Цяпер будзе новая „Крама" — магчыма, больш жорсткая па гуку, без клавішных. Проста „Крама" будзе крыху іншая. Якой, даведаемся ўжо ў гэтым годзе. Альбом пад працоўнай назвай „Бывай, мая Радзіма" выйдзе ўжо ўвосень, так як і дыск з лепшымі песнямі, перавыданне „Гарэлкі на лёдзе" і жывы канцэрт „Наваполацк-1996". 28 траўня „Крама" выступіць з акустычнай праграмай. За 13 гадоў існавання групы акустычны канцэрт будзе ўпершыню. Так што старыя гіты загучаць па-новаму.

14 траўня ў мінскім клубе „Рэактар" мае адбыцца рок-акцыя ў падтрымку Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа, зачыненага ўлетку 2003 года. Канцэрт будзе складацца з дзвюх асноўных частак: спачатку ліцэістаў будуць вітаць такія гурты як „Zet", „Haradzkija", „P.L.A.N.", магчыма, А. Памідораў, пасля адбудзецца паказ фільму пра ліцэй і яго абарону, знятага Юрыем Калінам, а потым адбудзецца доўгачаканая прэзентацыя новага ліцэйскага дыску „Я люблю ліцэй: Веру ў Цябе".

У продажы з'явіўся кампакт-дыск „Генералы айчыннага року", прымеркаваны да аднайменнага фэсту, які адбыўся днямі. Складанка ўтрымлівае новыя запісы шэрагу беларускіх гуртоў. Сярод іх „N.R.M.", якія нечакана зрабілі кавэр класікі савецкіх часоў. Яны запісалі „Лясную песню" („Ой бярозы ды сосны"). „Haradzkija" прэзентуюць на складанцы сваю новую песню „Так ці не". На CD „Генералы" ёсць таксама архіўныя запісы беларускіх рок-легендаў 1980-х. Гэткім чынам на дыску апынулася „Мроя" з „Я — рок-музыкант".

Татка Стэп

Адгаданка

							1	2	3
4	5	6	7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20	21	22	23
24	25	26	27	28	29	30	31	32	33
34	35	36	37	38	39	40	41	42	43
44	45	46	47	48	49	50	51	52	53
54	55	56	57	58	59	60	61	62	63

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прымаўку беларускага селяніна.

1. будаўнічы матэрыял, атрыманы з сумесі цэменту, вады, пяску, шчэбеню, які цвярдзее пасля ўкладкі
= 25 _ 30 _ 56 _ 57 _ 43 _;
2. невялікі, найчасцей лісцевы лес
= 5 _ 6 _ 58 _;
3. ні ў пяць, ні ў ...
= 19 _ 20 _ 8 _ 7 _ 61 _ 60 _ 37 _;
4. малы жук
= 34 _ 59 _ 62 _ 54 _ 2 _;
5. побач прозвішча
= 26 _ 31 _ 39 _;
6. польскі манарх
= 40 _ 3 _ 23 _ 24 _ 4 _ 17 _;
7. урачысты верш прысвечаны гістарычнай падзеі або герою
= 10 _ 9 _ 18 _;
8. 5 = 49 _ 50 _ 27 _ 28 _;
9. невялікая стракатая птушка атрада вераб'іных (*Paridae*)
= 29 _ 55 _ 22 _ 21 _ 16 _ 45 _;
10. гомельская рака
= 41 _ 42 _ 14 _;
11. агароднінная расліна, якая прымушае плакаць
= 36 _ 35 _ 11 _ 1 _ 32 _ 33 _;
12. прылада для ручной малацьбы
= 44 _ 63 _ 46 _;
13. 4 = 51 _ 38 _ 53 _ 48 _ 47 _ 15 _;
14. палеазой або мезазой
= 52 _ 12 _ 13 _; **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 14 нумара

Бычок, вежа, дзеяч, кава, Каін, Кіль, куніца, сюіта, цаля.

Рашэнне: **Баюся чалавека, які вучыцца толькі з аднае кніжкі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

16.05 – 22.05

Баран (21.03. — 19.04.) У палове мая будзеш перапоўнены энергіяй, адвагай і здольнасцю да рызыкі. Не раздумвай, ці ўсё тое ажыццяўляць, бо добры лёс і шчасце табе спрыяюць. Добры выгляд і самаадчуванне.

Бык (20.04. — 20.05.) Уваход Меркурыя ў Твой знак (16.05.) паўплывае на тое, што будзеш адчуваць сябе молада і схочацца табе рабіць такія рэчы, аб якіх ужо даўно не снілася! Не бойся выяўляць сваіх сапраўдных пачуццяў.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Дзякуючы ўваходу Сонца ў твой знак (20.05.) будзеш красавацца жыццёвай сілай, энтузіязмам. Адчуеш сябе як нованароджаны. Асаблівая падатлівасць на красу другога полу. Паміж 15 — 20.05. не наладжвай новых кантактаў, кампанейскія сустрэчы абмяжуй да мінімуму.

Рак (22.06. — 22.07.) Навучыся даравацъ партнёру. Дасягнеш таго, чаго хочаш, асабліва ў прафесійным суперніцтве. У фінансах лепш пасля 18.05.

Леў (23.07. — 22.08.) 14 — 18.05. заўважыш новыя магчымасці, дзякуючы якім шмат спраў рушыць дапераду. Новыя кантакты ці сувязі дазволяць табе паверыць у сябе. З 18.05. удасца табе перамагчы цяжкасці і зрабіць шмат карыснага сабе і іншым.

Дзева (23.08. — 22.09.) Маеш столькі ўсяго на галаве, што можа табе не хапіць часу з усім справіцца. Дзевы з апошняй дэкады будуць мець шчасце ў любові, хай толькі азірнуцца вакол сябе. Як ніколі, вельмі добрыя адносіны з атачэннем.

Шалі (23.09. — 23.10.) Маладзік Месяца (19.05.) — знакаміты момант на распачацце новай дзейнасці. Удадуцца праўныя і судовыя справы.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Важныя справы рашай, слухаючы розуму. Не кіруйся інтуіцыяй і эмоцыямі. Калі хочаш ангажавацца ў нейкае мерапрыемства, парайся з даверанай асобай. Твая зайздрасць не мусіць мець падстаў. Праблемы з дыхальнымі шляхамі.

Стралец (22.11. — 21.12.) 22 — 24.05. паявяцца карысныя прафесійныя і фінансавыя нагоды. Маладзік Месяца (19.05.) прынясе паправу ў прафесійнай сітуацыі. Новая прычоска адыме табе гадоў!

Казярог (22.12. — 20.01.) Не занядбоўваючы прафесійныя абавязкі, зразумееш, што ў жыцці лічыцца не толькі праца. Дай сабе больш свабоды. Варта выбрацца кудысьці з сям'ёй.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Да 19.05. — агромная доза энергіі. З 21 па 23.05. — нейлепшыя ідэі, якія памогуць вырашыць сямейныя і хатнія праблемы. Калі хочаш змяніць месца жыхарства, добрым часам будзе маладзік Месяца 19.05.

Рыбы (20.02. — 20.03.) 19 — 23.05. — час спрыяльны для творчых праектаў: інтуіцыя, уяўленне, патоп цудоўных ідэй. Не адкладвай іх у стол, адразу ажыццяўляй. Бярыся за рамонт кватэры.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960